Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:	
На 1 месяц	90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародніх	20 к.
мясцовых	10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:	
За радок нанпарэлі пасьля тэксту	50 к.
За радок нанпарэлі пасярод тэксту	1 р. — к.
За радок нанпарэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьпешныя на 50 проц. даражэй. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:	
За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 87 (2275) Чацьвер, 12-га красавіка 1928 г.

У пятніцу, 13-IV, а 6 гадз. увечары ў залі пасяджэньняў ЦК КП(б)Б

—) СКЛІКАЕЦЦА (—

НАРАДА ПА ПЫТАНЬНЯХ ЛІТАРАТУРНАЙ, МАСТАЦКАЙ І ТЭАТРАЛЬНАЙ КРЫТЫКІ.

На нараду запрашаюцца наступныя таварышы: Абрамчук, Сянькевіч, Жылуновіч, Шыпіла, Баліцкі, Вансоўскі, Чарот, Шукевіч-Трацьцякоў, Ліманоўскі, Александровіч, Дудар, Мурашка, Давідовіч, Ашаровіч, Барашка, Купцэвіч, Некрашэвіч, Каваль, Табайнік, Кацнэльсон, Шукайла, Якшэвіч, Матусаў, Міхайлаў, М. Гольдбэрг, Капаевіч, Вольскі, Аршанскі, Дунец, Адамовіч, Валабрынскі.

Сэкратар ЦК КП(б)Б ВАСІЛЕВІЧ.

За сапраўднае патаненьне савецкага апарату.

Другі пленум ЦКК УсеКП, які гэтымі днямі закончыў сваю працу, падагуліў вынікі барацьбы партыі за 20-проц. зьніжэньне адміністрацыйных выдаткаў. Гэтыя вынікі, якія зьяўляюцца вельмі актуальнымі, высоўваюць цэлы шэраг новых і зусім неадкладных задач перад усёй сыстэмай адміністрацыйных і гаспадарчых установ усяго Саюзу Рэспублік. Але асабліва важнае значэньне набываюць вывады ЦКК УсеКП для нізавых зьвеньняў адміністрацыйна-гаспадарчага апарату.

Аналіз кампаніі за 20-проц. зьніжэньне паказвае цэлы шэраг дасягненьняў. Наша гаспадарка ўжо дамаглася таго, што па ўсіх каштарысах адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў СССР удалося дасягнуць зьніжэньня на 335-340 міліёнаў руб. Агульная сума зьніжэньня адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў па ўстановах і прадпрыёмствах БССР складае 7 міліёнаў 75 тысяч руб. Гэтыя вынікі гавораць аб тым, што пэўны пералом ў справе патаненьня нашага апарату ўжо вызначан.

Тым ня менш толькі каштарыснае зьніжэньне далёка яшчэ не азначае рэальнае зьніжэньне. Гэта значыць, што зараз засталася найбольш цяжкая праца ў гэтай галіне. Мала яшчэ вызначыць выдаткі па каштарысу. Трэба яшчэ каб гэтыя каштарысы ажыцьцёвіліся. А гэта якраз у нас звычайна разыходзіцца з папярэднімі меркаваньнямі.

Папярэднія абсьледваньні сыгналізуюць нам аб тым, што з выкананьнем каштарысаў ня ўсё абстаіць добра. Фактычна мы маем па цэламу шэрагу ўстаноў значныя разыходжаньні ў выкананьні каштарысаў з тымі сумамі, якія былі вызначаны.

Галоўная прычына гэтых недахопаў крыецца ў тым, што шмат устаноў пры ажыцьцяўленьні дырэктывы аб патаненьні апарату галоўную сваю ўвагу зьвярнулі дробязям, менш значным артыкулам выдаткаў. Замест таго, каб ударыць па галоўнаму, па асноўнаму, замест таго, каб разгарнуць ініцыятыву мас, кіраўнікі гаспадаркі сваю ўвагу і ініцыятыву раскінулі па ўсякага роду дробязях, якія вялікага значэньня не адыгрываюць.

Зусім зразумела, дробязі іграюць вялікую ролю. На іх штодзень трэба зьвяртаць увагу для таго, каб паявілічыць эканомію на ўтрыманьне нашага апарату. Але дробязі заўсёды застануцца дробязямі і таму адсюль, у гэтым месцы ня можна чакаць рашаючага і шпаркага пералому ў барацьбе за танны апарат, паміж тым, бягучыя абставіны якраз гэтага пералому вымагаюць.

Тут сапраўды трэба разгарнуць шырокую арганізацыйную ініцыятыву. Трэба рашуча і карэнным чынам пераглядзець увесь апарат, яго функцыі і менш усяго ісьці па лініі найменшага супраціўленьня. Толькі такім шляхам можна дамагчыся ня толькі папернага, але і сапраўднага радыкальнага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і ўлады.

Вялізарную ролю ў барацьбе за танны адміністрацыйны апарат павінны адыгрываць працоўныя масы. Трэба разгарнуць ініцыятыву працоўных мас у барацьбе за танны апарат. НК РСІ Беларусі пачынае масавую праверку выкананьня дырэктыў аб зьніжэньні выдаткаў. Галоўная мэта гэтае праверкі заключаецца ў тым, каб высьветліць, як сапраўды выконваюцца дырэктывы партыі і ўраду. На кіраўнікоў устаноў і прадпрыёмстваў ускладаецца вялікая адказнасьць у гэтым напрамку. Яны павінны прасачыць за тым, каб ня было ніводнае ўстановы і прадпрыёмства ў БССР, дзе-бы пытаньне аб скарачэньні кіраўнічых выдаткаў ня было абгаворана на агульным сходзе і фактычна праверана вытворчымі і экапомкамісіямі кожны артыкул выдаткаў.

Друк і ўся рабселькораўская армія павінны быць прыцягнуты да гэтай мэты. Трэба рашуча выкарчаваць з нашага апарату ўсе праявы бюракратызму, якія ў ім ёсьць. Толькі пры дапамозе шырачэнных мас рабочых і сялян гэтая задача будзе выканана.

НАСТУП ІТАЛЬЯНСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ НА БАЛКАНЫ.

ФРАНЦУСКІ ДРУК Б'Е ТРЫВОГУ.

ПАРЫЖ, 10-IV. Французскі друк вельмі нэрвуецца ў зьвязку з дыплёматычнаю актыўнасьцю, якую выявіў апошні час Мусаліні. «Суар» падкрэсьлівае, што рэйнскія дыплёматычныя перамовы маюць на ўвазе або заснаваньне міжнароднае фашысцкае лігі, або нэйтралізацыю дзяржаў, якія абкружаюць Югаславію. „У абодвых выпадках,—піша далей газэта—палітыка Мусаліні набліжае эўрапейскі крызіс, бо як новы нажым на СССР, так і грубы нажым Італіі на ўрад Белграду няўхільна выклічуць катастрафічныя вынікі».

Гэтую-ж думку выказвае і левабуржуазная «Котыд'ен».

Орган радыкалаў „ля-Вуа", падкрэсьліваючы дзейнасьць Італіі і Албаніі і заявы Бэтлена ў вэнгерскім парляманце, бачыць у палітыцы Мусаліні, які імкнецца падначаліць уплыву Італіі некаторыя дзяржавы, непасрэдную пагрозу эўрапейскаму міру.

Газэта «Румэр», прыпісваючы Мусаліні плян заснаваньня саюзу між Італіяй, Баўгарыяй- Румыніяй, Вэнгрыяй, Грэцыяй і Турцыяй проці Чэхаславакіі, Югаславіі і Аўстрыі, дзівіцца, якім парадкам Залескі згаджаецца праводзіць перамовы аб італапольскай згодзе, якая няўхільна прывядзе Польшчу да канфлікту з Францыяй і яе балканскімі саюзьнікамі.

МІРНАЯ ДЫВЭРСІЯ МУСАЛІНІ Ў КРАІ МІЖЗЕМНАМОР'Я.

РЫМ, 9-4. «Папало Дыталія», адказваючы на артыкул «Тан» адносна спатканьня Мусаліні з турэцкім міністрам замежных спраў Тэўфік Рудшыбеем і грэцкім міністрам замежных спраў Міхалакапулосам піша: «Італія—адзіная дзяржава Міжземнага мора, якая імкнецца арганізаваць супрацоўніцтва Міжземнаморскіх краёў, між тым як іншыя дзяржавы, якія імкнуцца да ўстанаўленьня ўласнае гегемоніі, стараюцца іх разьяднаць. Італія наладзіла прыяцельскія адносіны з Гішпаніяю і зараз ужывае захады, каб наладзіць такія-ж адносіны з дзяржавамі ўсходняе паловы Міжземнага мора. Што датычыцца Грэцыі, дык кожны, хто быў на Усходзе, пераканаецца ў шчырасьці італа-грэцкага супрацоўніцтва».

„АДЗІН З ШМАТЛІКІХ МАНЭЎРАЎ ПРОЦІ СССР".

АЦЭНКА ЗАЛАТОГА ІНЦЫДЭНТУ Ў ФРАНЦУСКАЙ ПРЭСЕ.

ПАРЫЖ, 10-4. Французскія газэты паведамляюць аб адпраўцы назад савецкага золата са Злучаных Штатаў, бяз усякіх тлумачэньняў. Толькі «Суар» зьмяшчае пакопт гэтага артыкул, у якім зазначае, што факт вывазу сьведчыць аб няспрыяючых адносінах Злучаных Штатаў да прэтэнзій французскага банку. Падкрэсьліўшы далей, што гэтыя дамаганьні з боку французскага банку пасьля прызнаньня СССР зьяўляюцца беспадстаўнымі, газэта піша: «Тут мы маем справу з адным з шматлікіх манэўраў, накіраваных проці разьвіцьця СССР, гандлёвую дзейнасьць якога жадалі-б паралізаваць, каб дамагчыся разрухі ў гэтым краі. Трэба думаць, што Злучаныя Штаты не адважыліся на гэты раз далучыцца да гэтага манэўру, бо яны не зьвярнулі ўвагі на дамаганьні французскага банку».

У Японіі выкрыта камуністычная змова?

БЛЫТАНЫЯ ПАВЕДАМЛЕНЬНІ ПАЛІЦЭЙСКАГА БЮЛЕТЭНЯ.

Тысячы арыштаваных па ўсіх гарадох.

ТОКІЁ, 10-4. Агенцтва Сімбун Рэнго паведамляе: „Сёньня, пасьля папярэдняга сьледзтва, зьнята забарона перадаваць заграніцу паведамленьні адносна камуністычнае змовы, якая выкрыта паліцыяю 15-га сакавіка. Прозьвішчы арыштаваных па гэтай справе не агалошаны, аднак вядома, што **КОЛЬКАСЬЦЬ АРЫШТАВАНЫХ ПЕРАВЫШАЕ ТЫСЯЧУ**".

У паведамленьні паліцэйскага кіраўніцтва Токіё гаворыцца аб патаемнай камуністычнай канфэрэнцыі, якая адбылася ў Госікі ў сьнежні 1927 г. Канфэрэнцыя адбылася пад выглядам нарады дырэкцыі і служачых электрычнае кампаніі, аднак узьняла падазрэньне паліцыі. Паліцыя-ж аднак атрымала канкрэтны абвінаваўчы матар'ял толькі ў часе перадвыбарчае кампаніі ў лютым 1928 г., калі па ўсім краі распаўсюджваліся рэвалюцыйныя плякаты і лістоўкі.

Вобыскі і арышты адбыліся таксама ў гарадох Осака, Кіёто, Нагойя і інш.

Далей у бюлетэні паліцэйскага кіраўніцтва зазначана, што «камуністычны рух у Японіі атрымаў штуршок увесну 1927 г., калі вярнуліся з СССР камуністычныя лідэры, дзе яны вывучалі тактыку Камінтэрну. У той-жа час японская кампартыя была рэарганізавана на ўзор маскоўскае. Выкрытая паліцыяю арганізацыя пабудована на ўзор партый Камінтэрну. На чале руху стаялі студэнты і прафэсары, арганізаваныя ў фракцыі».

ЛЕВЫЯ РАБОЧА-СЯЛЯНСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ РАЗАГНАНЫ.

ТОКІЁ. Урад аддаў загад распусьціць арганізацыі левае «рабоча-сялянскае партыі», левага саюзу моладзі, а таксама аб'яднаньне рэвалюцыйных прафсаюзаў, нібы за парушэньне імі закону грамадзкае безапаснасьці.

Міністр унутраных спраў у гутарцы з прадстаўнікамі друку заявіў, што гэтыя арганізацыі распушчаны за «супрацоўніцтва з камуністамі».

БУРЖУАЗНАЯ АПАЗІЦЫЯ ПАДТРЫМЛІВАЕ ЎРАД.

ТОКІЁ, 10-4. Лідэр апазіцыйнае «канстытуцыйна-дэмакратычнае партыі» заявіў адносна роспуску ўрадам партыі левае «рабоча-сялянскае партыі», левага саюзу моладзі і левага аб'яднаньня прафсаюзаў, што роспуск гэтых крайніх арганізацый, зьвязаных з Камінтэрнам, зьяўляецца натуральным

Разрыў між правадырамі і рабочымі масамі ў Англіі.

МОЦНЫ РУХ ЗА АДНАЎЛЕНЬНЕ АНГЛА-РАСЕЙСКАГА К-ТУ АДЗІНСТВА.

ЛЁНДАН, 10-4. НА ГАДОВЫМ ЗЬЕЗЬДЗЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА САЮЗУ РАБОЧЫХ-КРАМНІКАЎ УЗЬНІКЛА ГАРАЧАЯ ДЫСКУСІЯ ВАКОЛ РЭЗАЛЮЦЫІ, ПАДАДЗЕНАЕ 7-МЮ АБ'ЯДНАНЬНЯМІ САЮЗУ З ЗАТРАБАВАНЬНЕМ АДНАВІЦЬ АНГЛА-РАСЕЙСКІ КАМІТЭТ. АПРОЧ ТАГО ГЭТАЯ РЭЗАЛЮЦЫЯ ПАТРАБУЕ, КАБ ГЕНЭРАЛЬНАЯ РАДА ПАДТРЫМАЛА СКЛІК СУПОЛЬНАЕ КАНФЭРЭНЦЫІ ПРАФІНТЭРНУ І АМСТЭРДАМСКАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ БЯЗ УСЯКІХ ПАПЯРЭДНІХ УМОЎ; РЭЗАЛЮЦЫЯ ЗАКЛІКАЕ АНГЕЛЬСКІ САЮЗ РАБОЧЫХ-КРАМНІКАЎ ЗАСНАВАЦЬ АНГЛА-РАСЕЙСКІ КАМІТЭТ РАБОЧЫХ КРАМНІКАЎ.

ПРОЦІ РЭЗАЛЮЦЫІ З ВОСТРАЮ ПРАМОВАЮ ВЫСТУПІЎ ДЭВІС (ЯКІ ЗАЙМАЎ ПАСАДУ НАМЕСЬНІКА МІНІСТРА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ ВА ЎРАДЗЕ МАКДАНАЛЬДА). ДЭВІС ІЗНОЎ НАПАДАЎ НА СССР, КАЗАЎ АБ «ЧЫРВОНЫМ ІМПЭРЫЯЛІЗЬМЕ» І Г. Д. У ВЫНІКУ, БОЛЬШАСЬЦЮ 120 ГАЛАСОЎ ПРОЦІ 64 РЭЗАЛЮЦЫЯ БЫЛА ЗЬНЯТА З АБГАВОРУ.

НА ЗЬЕЗЬДЗЕ НЕЗАЛ. РАБОЧАЕ ПАРТЫІ.

ЛЁНДАН, 10-IV. Па сёньнешнім пасяджэньні зьезду незалежнае рабочае партыі ў Норвічы старшынёю партыі пераабраны Мэкстон, членамі нацыянальнае адміністрацыйнае рады—Керквуд, Мосьлі і Шынвэль. Уолхед у нацыянальна-адміністрацыйную раду не пераабраны.

РАСТРЭЛ БАСТУЮЧЫХ ЧЫГУНАЧНІКАЎ У ІНДЫІ.

ЛЁНДАН, 2-IV. Рабочы друк агалашае паведамленьне прафсаюзу індыйскіх чыгуначных рабочых аб растрэле бастуючых чыгуначнікаў у Лілуа (Усходняя Індыя). Паліцыя пачала без папярэджаньня страляць па мірных рабочых пікетах і забіла 5 бастуючых рабочых і 35 параніла.

Правакацыйная чыннасьць паліцыі выклікала ў Індыі бурныя пратэсты.

У сучасны момант у Індыі лёкаўтавана ці бастуе 20 тысяч чыгуначнікаў. 6 тысяч мэталістаў абвясьцілі забастоўку спачуваньня чыгуначнікам.

ДЭЛЕГАЦЫЯ АСЬВЕТНІКАЎ СССР НЯ ЎПУШЧАНА Ў ЛЕЙПЦЫГ.

ПРАТЭСТ МІЖНАРОДНАГА ПЭДАГАГІЧНАГА КАНГРЭСУ.

БЭРЛІН, 10-4. У панядзелак ў Лейпцыгу адчыніўся пэдагагічны кангрэс, склікаты міжнародным аб'яднаньнем працаўнікоў асьветы. Пасьля адчыненьня кангрэсу старшыня паведаміў, што дэлегацыя з СССР адсутнічае на кангрэсе, бо члены дэлегацыі не атрымалі візы на выезд у Нямеччыну, а старшыня выканкому аб'яднаньня ў Парыжы Вэрношэ атрымаў ад французскага ўраду заграпічны пашпарт толькі ў тою ўмоваю, каб ён ня выступаў у Нямеччыне ні на якіх мітынгах і маніфэстацыях.

Кангрэс аднагалосна ўхваліў рэзалюцыю, у якой пратэстуе проці адмовы ў візах членам дэлегацыі з СССР і патрабуе, каб нямецкі ўрад пераглядзеў сваю пастанову аб адмове.

Аўганскі падышах у Бэрліне.

БЭРЛІН, 9-4. Прыехаў праездам з Парыжу аўганскі падышах Аманулла.

Пародыя на партыю.

«ЗЬЕЗД» РЭНЕГАТАЎ КАМУНІЗМУ.

БЭРЛІН, 9-4. Агенцтва Вольфа паведамляе, што на вялікодныя сьвяты ў прускім ляндтагу адбыўся ўстаноўчы зьезд «Ленінбунду», арганізаваны ультра-левымі, выключанымі з кампартыі Нямеччыны (Маслаў, Урбанс, Рут Фішэр, Вэбер). Пастаноўлена высунуць уласныя кандыдатуры на выбарах у рэйхстаг і ляндтагі, а таксама на камунальных выбарах.

Далей пастаноўлена зьвярнуцца да выканкому Камінтэрну з адкрытым лістом, у якім будзе запрапанавана ўвесьці «Ленінбунд» у Камінтэрн у якасьці спачуваючае арганізацыі. Калі гэтая прапанова будзе прынята, дык «Ленінбунд» згодзен «адмовіцца ад самастойнага ўдзелу ў надыходзячых выбарах і будзе падтрымліваць нямецкую кампартыю».

Палітычны крызіс у Румыніі.

РЭПРЭСІІ БРАТЫЯНУ ПРОЦІ НАЦЫЯНАЛЬНА-СЯЛЯНСКАЕ ПАРТЫІ.

ВЕНА, 10-4. Водлуг паведамленьня з Бухарэсту, румынскі ўрад забараніў назначаны на 20 красавіка зьезд нацыянальна-сялянскае партыі. На пасяджэньні парляманцкае фракцыі ўрадавае партыі лібэралаў, прэм'ер Братыяну заявіў, што ўрад ні ў якім выпадку не дазволіць, каб зьезд нацыянальна-сялянскае партыі адбыўся; «у крайнім выпадку, заявіў Братыяну, урад можа дазволіць зьезд у якім-небудзь іншым горадзе».

Пазыка для Баўгарыі.

НЬЮ-ЁРК, 9-4. Водлуг вестак з Жэневы, фінансавая камісія рады Лігі Нацый ухваліла плян наданьня Баўгарыі пазыкі ў 25 міліёнаў даляраў. Пазыка будзе разьмешчана ў Злучаных Штатах і Англіі.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1-ай г. ночы).

АДЧЫНІЛАСЯ СЭСІЯ ЦВК СССР.

МАСКВА. 11-га красавіка а 6-й з паловаю гадз. увечары ў Андрэеўскай залі Вялікага Крамлёўскага палацу адчынілася 3-я сэсія ЦВК СССР чацьвертага скліку.

ЗЬМЕНЫ Ў СКЛАДЗЕ АРГБЮРО ЦК.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) вызваліў тав. Андрэева, з прычыны яго пераходу на працу на Паўночны Каўказ, ад збавязкаў сябра аргбюро ЦК і ўвёў замест яго ў склад аргбюро і кандыдатам у сябры сэкратарыяту ЦК тав. Баўмана. У склад кандыдатаў у сябры аргбюро ўведзен тав. Антыпаў.

УЗБРОЕНЫЯ КАМУНІСТЫ ВЫЗВАЛІЛІ БРАУНА.

БЭРЛІН, 11-IV. Агенцтва Вольфа паведамляе: «Група ў 6-8 узброеных маладых камуністаў прабралася сёньня раніцою ў прыёмную сябра агульнанямецкага дзяржаўнага суду Фохта і вызваліла літаратара Брауна, зьняволенага па абвінавачаньні ў дзяржаўнай здрадзе. Затрымаць Брауна не ўдалося.

Камуністы прыкусілі рэвальвэрамі чыноўніка ўзьняць рукі ўгару. Судовы прыстаў, які спрабаваў абараняцца, быў звален ударамі гумовага кія, а сэкратар суду—схоплен за глотку.

Не зважаючы на агульны пярэпалах, камуністы ўцяклі ў загадзя падрыхтаваных аўтамабілях. Толькі адзін з іх затрыман. Ён адмовіўся даць весткі аб сваім паходжаньні і сацыяльным становішчы.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

Пахаваньне А. А. Багданава.

МАСКВА, 10-IV. 10 красавіка адбылося пахаваньне Багданава. У памяшканьні інстытуту пераліваньня крыві, дзе стаяла труна з целам нябожчыка, адбылася грамадзянская паніхіда. Значэньне Багданава, як чалавека і барацьбіта, ахарактарызавалі ў сваіх прамовах т. т. Фрычэ і Даўге. Тав. Семашка казаў аб нябожчыку як аб вучоным біолёгу-рэвалюцыянэры, які прайшоў бальшавіцкую школу.

Тав. Бухарын у сваёй прамове казаў: кампартыя ня любіць ні сантымэнтальнасьцяў, ні кампрамісаў. Тав. Багданаў калісьці парваў з нашай партыяй і пашоў на іншы шлях. Тым ня менш партыя ня можа ня быць удзячнаю т. Багданаву за яго працу ў той час, калі ён змагаўся ў яе шэрагах за яе ідэі. Мы—група членаў ЦК—прышлі ад імя партыі аддаць апошнюю пашану чалавеку, імя якога заслугоўвае быць вылучаным з шэрагу іншых. У асобе Багданава з арэны жыцьця зышоў адзін з вялікіх людзей—па шырыні свайго розуму, па энцыклёпэдычнасьці сваіх ведаў, па сіле волі і энэргіі. Гэтыя яго якасьці прымушаюць нас схіліць перад ім свае сьцягі.

Пасьля прамоў цела Багданава было спалена.

Вялікія савецкія пералёты.

МАСКВА, 10-IV. У бліжэйшыя месяцы пачынаюцца вялікія савецкія пералёты 1928 г. У сярэдзіне чэрвеня адбудзецца зорачны зьлёт самалётаў у Маскву з 9 пунктаў эўрапейскае часткі СССР. У першай палове ліпеня адбудзецца вялікі зорачны пералёт у Маскву цэлых авіяцыйных атрадаў. Атрады вылецяць з 8 пунктаў. У жніўні адбудзецца новы зьлёт з шэрагу пунктаў СССР авіяцыйных частцей—пераможцаў на акруговых авіяцыйных спаборніцтвах.

Для гідраавіяцыі ТДА-Авіяхім СССР арганізуе групавы пералёт з Сэвастопалю ў Ленінград па сыстэме рэчак Дону і Волгі і іх каналаў. У ліпені-жніўні арганізуецца вялізарны трансатлянтычны пералёт гідра-самалёту «Красный Север» па маршруце ад Петрапаўлаўска на Камчатцы да Ленінграду.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

БУНТ ВЯЗЬНЯЎ.

У Плоцку выбухнуў бунт вязьняў. Для стрыманьня бунту былі выкліканы войскі, паліцыя і пажарная каманда, якая аблівала вязьняў вадою. Бунт быў прыдушан толькі пасьля некалькіх гадзін.

ПЭПЭСЫ І ПІЛСУДЧЫКІ.

«Дзеньнік Віленьскі» (№ 81) паведамляе, што між пэпэсамі і групай пілсудчыкаў ідуць найляпшыя перамовы на тэму аб зьмене маршалка сойму і ўзаемнага паразуменьня.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ЎСХОДНІХ ТАРГОЎ.

У Вільні ідзе падрыхтоўка да так званых «Усходніх таргоў», г. ё. да сельскагаспадарчае і прамысловае выстаўкі, у якой прымуць удзел польскія і замежныя фірмы.

ЛІКВІДАЦЫЯ МАЕМАСЬЦІ «ГРАМАДЗЯНСКАГА САБРАНЬНЯ».

На адбытым гэтымі днямі агульным пасяджэньні „Беларускага грамадзянскага сабраньня" пастаноўлена перадаць усю маемасьць таварыства Беларускаму т-ву дабрачыннасьці.

ВЫКРАДАНЬНЕ МАП.

Гэтымі днямі ў Варшаве арыштован служачы вайск. географ. інстытуту Я. Уладарскі па абвінавачаньні ў выкраданьні і продажу геаграфічных карт інстытуту. Арыштован яшчэ нейкі Бацяноўскі, якому Уладарскі бышпам прадаваў памяпёныя мапы.

УЗРОСТ ДАРАГОЎЛІ.

Мясцовыя камісіі для абсьледваньня коштаў утрыманьня сьцьвердзілі наступны ўзрост дарагоўлі ў сакавіку: у Лодзі—2,68 проц., у Познані—1,87 проц., у Любліне—1,72 проц., у Катовіцах—1,03 проц.

АДНАДНЁЎКА „КРАСАВІК".

5 красавіка г. г. у Вільні вышла аднаднёўка „Красавік" і ў той самы час ня вышла радыкальная беларуская газэта „Воля Працы". Відаць, што яна зачынена адміністрацыяй.

ПАЗЫКА ВІЛЬНІ НА КАНАЛІЗАЦЫЮ.

Віленскі магістрат атрымоўвае кароткатэрміновую пазыку ў 4 міліёны злотых на закапчэньпе працы па праўдзеньню каналізацыі.

Праэктуецца замежная пазыка на камунальнае будаўніцтва Вільні.

ЗА ДЗЕНЬ.

Чаму замежны друк крычыць аб арыштце нямецкіх інжынэраў у Данбасе.

Усякае выступленьне савецкае дыплёматыі за межамі звычайна прыцягвае да сябе ўвагу працоўных масаў усяго сьвету і выклікае абурэньне ўсіх імпэрыялістаў і ўсяго буржуазнага друку. Выступленьне тав. Літвінава ў Жэневе па пытаньні аб разброеньні, якое паказала ўсяму сьвету прадажнасьць і фальш усіх буржуазных разгавораў аб разброеньні узьняла вялікі лямант ва ўсіх буржуазных колах. Пачалі шукаць «фактаў», якія павінны былі паказаць прапагандысцкі характар выступленьняў савецкае дэлегацыі. Гэта не ўдалося. Тады знайшлася прычына каб узьняць вялікую супроцьсавецкую кампанію ў зьвязку з арыштамі нямецкіх інжынэраў, якія ўдзельнічалі ў контр-рэвалюцыйнай змове ў Донбасе.

Карэспандэнты «Бэрлінэр Тагеблят» і „Фосішэ Цайтунг", якія быццам, выказвалі жаль з прычыны таго, што савецкая дэлегацыя ня хоча стаць на пункт погляду тых прапаноў, якія ўносіліся ўсімі дыпламатамі на гэтай канфэрэнцыі увесь час імкнуліся замазаць тую ўнутраную сувязь, якая існуе паміж асобнымі краінамі на канфэрэнцыі ў іх агульнай палітыцы да СССР. Савецкі друк з самага пачатку гэтую сувязь адзначаў. Зараз правільнасьць падазрэньня, выказанага з савецкага боку, поўнасьцю пацьвярджаецца ангельскім журналістам, які лепш за іншых знаёмы з тайнымі пружынамі вялікай эўрапейскай палітыкі. Мы гаворым аб славутым Аўгуры—расейскім эмігранце Палякове—давераным Цірэля і Чэмбэрлена. Ня толькі савецкая прэса, але і ўвесь буржуазны друк бязупынна падкрэсьлівае сьвядомасьць Аўгура і часамі заве яго шантэклёрам ангельскай дыплёматыі. І вось гэты самы Аўгур у артыкуле, надрукаваным гэтымі днямі ў варшаўскай газэце «Кур'ер Поранны», піша: «Рашэньне Штрэзэмана спыніць перамовы з савецкімі дэлегатамі на бэрлінскай канфэрэнцыі супала з арыштам нямецкіх інжынэраў. Гэткае рашэньне выявілася ўжо ў часе апошняга пасяджэньня савету Лігі Нацый».

Мы ня ведаем, ці будзе прыемнай Штрэзэману ці маскоўскаму карэспандэнту «Бэрлінэр Тагеблят» п. Шэферу шчырая заява Аўгура. У кожным выпадку, савецкая грамадзкасьць не пярэчыць супроць гэткага роду выкрыцьця, якое вельмі цьвёрда даводзіць, наколькі правы савецкі ўрад і разам з ім савецкі друк, адмаўляючыся верыць у шчырасьць абурэньня нямецкага друку арыштам некалькіх нямецкіх інжынэраў. Заява Аўгура пацьвярджае нашае меркаваньне, што бэрлінская канфэрэнцыя склікана зусім не для выпраўленьня таго ці іншага пункту гандлёвага дагавору, а для таго, каб падарваць аснову вядзеньня нашай гаспадаркі. Расчараваньне адмовою савецкае дэлегацыі ў Бэрліне прызнаць магчымасьць адхіленьня ад прынцыпу згрупаваньня гандлёвых зносін з заграніцаю ў руках савецкага ўраду было, як відаць, надзвычайна вялікае і пастаноўлена было перайсьці да пагрозы непасрэднага націску Вышэйпамянёны Шэфэр лічыць патрэбным пусьціць у ход «папярэджаньне». Ён заяўляе, што калі савецкі ўрад ня стане на нямецкі пункт погляду, дык «няправільныя ідэі Крэмля паставяць пад пагрозу нямецка-савецкія ўзаемаадносіны, а таксама далейшую міжнародную экспансію СССР, якая вабіць з таго боку акіяну». Як бачыць чытач, Шэфэр ня двухсэнсоўна намякае, што яго вуснамі гаворыць ня толькі нямецкі капітал, але і амэрыканскі. Мы ўжо пісалі аб існаваньні гэткае антысавецкае змовы, хоць бы і нефармальнай. Нашы меркаваньні пацьвярджаюцца ня толькі вышэйпамянёнымі намёкамі Шэфэра, але і зазначэньнямі міжнароднага аглядацеля «Фосішэ Цайтунг» Ганса Цэрэра, які ў нумары газэты ад 16 сакавіка піша: «Першым крокам да антысавецкай канцэнтрацыі капіталістычных дзяржаў зусім не павінна зьявіцца пісьмовая згода; гэты крок можа быць у чымсьці накшталт джэнтльмэнскай салідарнасьці паміж Лёнданам і Вашынгтонам. Гэтая салідарнасьць ужо выявілася ў нядаўняй прапанове дэ-Моньзі аб стварэньні агульнага канцэрну для гандлю з СССР».

Урэшце, орган рэйнскай цяжкай прамысловасьці „Дэйтшэ Бэргвэркс Цайтунг" ідзе яшчэ далей. Са здаваленьнем канстатуючы шчыльнае эканамічнае супрацоўніцтва паміж Нямеччынай і Францыяй і вітаючы прапанову французскага дыплёматычнага пісьменьніка Жака Сэйду, каб Англія далучылася да гэтага супрацоўніцтва, гэта газэта піша: «Гэткае супрацоўніцтва трох дзяржаў зьяўляецца вельмі неабходным. Яно не павінна абавязкова выліцца ў антысавецкі фронт (!). Ніякім чынам (!?). Але яно магло-б абясшкодзіць некаторыя непажаданыя выяўленьні камуністычнай палітыкі Масквы».

«Ніякім чынам»—добра сказана! Так з-пад авечай шкуры выглядае воўчая пасьць.

Кангрэс рэнэгатаў ленінізму.

Маслаў, Рут Фішар, Шолэм, Вэбэр і інш. гэтымі днямі склікалі ўстаноўчы зьезд сваёй новай партыі, якую яны адважыліся назваць «Ленінскім саюзам». Зьезд арганізаваны вельмі ўрачыста. Ён засядае ў вялікай залі пасяджэньняў прускага ляндтагу. Пасяджэньні праходзяць адчыненыя. Вялікі наплыў прадстаўнікоў друку, асабліва карэспандэнтаў буржуазных і сацыял-дэмакратычных газэт.

Але каго-ж аб'ядноўвае гэты ўрачысты зьезд? Заснавальнікамі і натхніцелямі саюзу зьяўляюцца даўнейшыя ворагі Камуністычнага Інтэрнацыяналу і СССР—Маслаў і Рут Фішэр. Вакол іх згрупаваліся ўсе правадыры бяз арміі, выключаныя з нямецкай кампартыі за фракцыйную разлагаючую працу. Нядаўна да іх далучыліся апошнія з гэтых „правадыроў" Вэбэр, арганізатар Вэдынгскага рабочага раёну ў Бэрліне. Вэдынг доўгі час трымаўся ультра левай пазіцыі. Але на апошняй канфэрэнцыі Вэдынга, на якой абмяркоўвалася выключэньне Вэбэра з партыі, за лінію ЦК і супроць ультра-левых раскольнікаў выказалася 121 чал. проці 43. Такім чынам, «Ленінскі саюз» набыў Вэбэра, але страціў пралетарскі Вэдынг.

Ультра-левыя рэнэгаты лічылі „сваім" чырвоны Гамбург. Аднак, калі яны спрабавалі высунуць свой сьпіс на гарадзкіх выбарах у Альтоне (рабочае прадмесьце Гамбургу), яны з трэскам праваліліся. Другая цытадэль ультра-левых гор. Зуль, дзе яны выдаюць сваю газэту „Фольсвільле". Аднак, на выбарах у прафсаюзныя органы ў Зуле нямецкая кампартыя атрымала пераважную большасьць галасоў і разьбіла і ультра-левых і сацыял-дэмакратаў.

Зараз ультра-левыя страцілі і Вэдынг.

Саюз рэнэгатаў ленінізму хоча выступаць на выбарах самастойна. Паражэньне яму забясьпечана. Масы ня ідуць і ня пойдуць за ім. Наадварот, апошнія рабочыя, якія ішлі за ім, адступіліся ад яго.

Перад вясеньняй сяўбой.

ПРАВЕРКА ПАДРЫХТАВАНАСЬЦІ ДА СЯЎБЫ.

ГОМЕЛЬ, 11-IV. Акрвыканком зрабіў праверку падрыхтаванасьці раёнаў да пасеўнай кампаніі. У большасьці раёнаў падрыхтоўка праведзена здавальняюча. Але ёсьць шмат і недахватаў, якія адаб'юцца на выкананьні пасеўных плянаў.

У Рэчыцкім раёне да моманту прыезду упаўнаважанага Акрвыканкому нават ня была канчаткова распрацавана тэхніка разьмеркаваньня насеньня. У Брагінскім раёне старшыня сельска-гаспадарчага таварыства ў самы разгар кампаніі сядзіць у Воршы. Ён там прадаў 800 пуд. канюшыны, якая аказалася засьмечанай. Таму ён тры тыдні сядзеў у Воршы і ачышчаў канюшыну. Пасеўная кампанія ў Брагіне не чакала. Сяляне са сьпісамі прыехалі за насеньнем, а бяз старшыні праца ідзе слаба.

Выявілі выпадкі бюракратычных адносін да сялянства. Селяніну, які прыехаў за насённай пазыкай на 10—15 руб., прапанавалі раней уступіць пайшчыкам, заплаціўшы паявы ўзнос і г. д. Селянін пачухае патыліцу і адыходзіць. А ў вёсцы кулак, падслухаўшы неадабраючыя заявы па адрасу каапэрацыі, заводзіць гутарку:

— Глядзі, пазыку даюць не насеньнем, а грашыма. Авёс зараз 1 р. 75 к. пуд., а увосень будзе па 90 кап. і замест аднаго пуду, будзеш мець два пуды. Вось якія савецкія парадкі. Ты лепш у мяне пуды 3—4 вазьмі, увосень вернеш пудамі, ды яшчэ трохі адпрацуеш.

У Лоеўскі раён прывезьлі з Калугі авёс дрэннай якасьці, у той час, як гэты авёс можна было загатовіць у акрузе. У крэдытных таварыствах заяўкі сялян на крэдыты затрымліваюцца ў працягу месяца. У некаторых раёнах ня ў поўнай меры выкарыстоўваюцца крэдыты па вызначэньні.

Усе гэтыя недахваты штурхаюць бедняка і серадняка да кулака.

НЕ ХАПАЕ ЛЁНУ-ДАЎГУНЦУ, ЛУБІНУ і ШТУЧНАГА ЎГНАЕНЬНЯ.

У часе пасеўнай кампаніі ў раёне будуць арганізаваны 2 працоўныя земляробчыя арцелі, 3 малочныя арцелі, 1 насеннае таварыства, 5—машынных, 1 пасёлак і 2 злучныя пункты. Таксама будзе аказана дапамога ўсім арцелям і калгасам, якія ўжо працуюць.

Бядняцкія гаспадаркі будуць у першую чаргу здавальняцца насеньнем, угнаеньнем, машынамі і інш. На гэтыя патрэбы неабходна атрымаць 16,400 руб. крэдыту, каб цалкам задаволіць бядняцкія гаспадаркі. Бясконным гаспадаркам, якіх у раёне маецца 600, адпушчана 2 з пал. тысячы руб. крэдыту. Але яго ня хопіць для здавальненьня ўсіх бясконных гаспадарак.

Камітэтамі ўзаемадапамогі будзе пазычана 4.612 пуд. насеньня.

Пасяўная плошча агульна будзе павялічана на 904,2 дзесяціны, альбо на 19 проц. Яравы клін у параўнаньні з 1927 г. павялічваецца на 669 дзесяцін, ці на 2,2 проц. Асаблівая ўвага зварочваецца на пашырэньне засеву бульбы, аўсу і караньплодаў.

Усім насеньнем, апрача лубіну і лёну-даўгунцу, насяленьне будзе здаволена цалкам. Усе маламоцныя гаспадаркі на ўсе 100 проц. атрымаюць насеньне ў крэдыт.

Будзе адчувацца недахват і штучнага ўгнаеньня, якога загатоўлена мала а патрэбы вялікія. Усяго патрэбна 12 тыс. тамасшлаку, 25 тыс. супэрфасфату, 3,25 тыс. фосфарнай мукі і 7 тыс. калійнай солі. Гэткай колькасьці ў раён завезена ня будзе і ўсіх попытаў з боку сялянства нельга будзе здаволіць.

Слаба, трэба прызнацца, праходзіць і зернаачыстная кампанія. Да гэтага часу абозамі ачышчана ўсяго 15-20 проц. насеньня. Ёсьць шмат прычын, якія перашкаджаюць нармальнаму правядзенью гэтай кампаніі. Аднэй з галоўных зьяўляецца адсутнасьць у вёсках спэцаў, якія маглі-б кіраваць машынамі. Часта бывае так, што, калі перавязуць абоз у суседнюю вёску, там доўга „круцяць“ машыну, пакуль навучацца карыстацца ёю. Часта ў часе перавозкі машыны псуюцца, а наладзіць некаму. Частка сялянства ручным спосабам ачышчае насеньне і ня хоча ў другі раз перачышчаць яго. Гэтыя прычыны найбольш і перашкаджаюць у нармальнай працы.

У часе пасяўной кампаніі будзе закладзена 50 паказальных вучасткаў на сродкі мясцовага бюджэту і ў сялянпадсьледчыкаў. На шматпольле будзе пераведзена 5 выселкаў і частка калгасаў, усяго 2500 дзесяцін.

За час кампаніі будзе праведзена 5 сельска-гаспадарчых курсаў і прачытана 120 лекцый і садакладаў.

Слуцкі раён. Б. А.

У с.-гасп. каапэрацыю сёлета будзе ўцягнута 49.000 бядняцкіх гаспадарак.

Праўленьне Белсельбанку выдзеліла з сваіх прыбыткаў на каапэраваньне бядняцкіх гаспадарак 70.000 руб, і акрсельбанкі—24.000 руб. Апрача таго, на каапэраваньне беднаты з прыбыткаў Цэнтральнага Сельска-Гаспадарчага Банку будзе адпушчана для БССР 40.000 руб.

Агулам, на каапэраваньне беднаты, ня лічачы сродкаў, якія выдзелены нізавой сеткай сельска-гаспадарчай крэдытнай каапэрацыі, сёлета адпушчана 134.000 руб.

З агульнай сумы 26.000 руб. вызначана на каапэраваньне беднаты ў спэцыяльных відах с.-гасп. каапэрацыі: малочных, машынных і іншых вытворчых таварыствах. На гэтыя сродкі будзе каапэравана 13.000 бядняцкіх гаспадарак. Рэшта—108.000 руб.—ужо разьмеркаваны па с.-гасп. крэдытных таварыствах БССР і на іх будзе каапэравана па крэдытных таварыствах звыш 20.000 бядняцкіх гаспадарак.

Апрача таго, на сродкі, якія выдзеліла нізавая сетка с.-гаспадарчай крэдытнай каапэрацыі, будзе каапэравана да 16.000 бядняцкіх гаспадарак.

Такім чынам, сёлета ў БССР па ўсіх відах сельска-гаспадарчай каапэрацыі будзе каапэравана 49.000 бядняцкіх сялянскіх гаспадарак.

Праўленьне Белсельбанку дало на месцы дырэктывы, каб сродкі на каапэраваньне беднаты былі поўнасьцю скарыстаны да 1-га чэрвеня. Гэта дасьць магчымасьць беднаце яшчэ ў часе пасеўнай кампаніі ўступіць пайшчыкамі ў с.-гасп. каапэрацыю.

109.500 руб. крэдыту на кантрактацыю насеньня.

Праўленьне Белсельбанку разьмеркавала па акругах 109.500 р. крэдыту на кантрактацыю насеньня. З гэтай сумы на канюшыну адпушчана: Бабруйску—20625 руб., Віцебску—18750 руб., Меншчыне—12.000 р. і 23.525 р. іншым акругам; на насеньне броварнага ячменю: Менскай акрузе—7.500 руб. і Бабруйскай—4.500 руб.; на кантрактацыю насеньня лубіну: Бабруйшчыне—6.000 р., Гомельшчыне—4.500 р., і Меншчыне—12.000 руб.

РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ І АЧЫСТКА НАСЕНЬНЯ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫЯ

У мінулым годзе Ветрынскае крэдытнае т-ва мела ў выстарчальнай колькасьці насеньня канюшыны, але набыць яго па ільготных умовах змаглі выключна сяляне - пайшчыкі т-ва. Спачатку-ж шырока абвясьцілі насельніцтву, што неабходна толькі вясковым сходам зрабіць пастановы аб пераходзе на травасеяньне і падаць заяўкі на насеньне ў т-ва як адразу, незалежна ад таго хто пайшчык, хто не, усе сяляне атрымаюць патрэбнае. Пачалі склікацца вясковыя сходы, якія настойліва патрабавалі насеньня траў. Потым зьяўляюцца ў т-ва ўпанаважаныя ад вёсак за атрыманьнем насеньня. Ім адказваюць:

— Уступіце ў пайшчыкі—задаволім заяўкі на канюшыну.

Гэткая пастаноўка пытаньня прымусіла бяднейшае сялянства пакінуць думку аб увядзеньні травасеяньня ў сваёй гаспадарцы, бо ў цяжкі час вясеньняга севу ўнесьці пай для бяднейшых сялян—справа цяжкая. У крэд. т-ве ў выніку такой «палітыкі» разьмеркаваньня насеньня канюшыны засталося яго больш 50 пудоў нерэалізаваным, якое цяпер большай часткай ужо папсавалася і для севу ў сёлетнім годзе ўжо не гадзіцца. Якія-ж вынікі адсюль зрабілі належныя органы Ветрынскага раёну?

А ніякіх: сёлета парадак набыцьця насеньня канюшыны такі-ж, як і летась. Між тым, гэтага насеньня ёсьць шмат у т-ве. Жадаем павялічыць травасеяньне і самі абмяжоўваем імкненьне сялян да гэтага.

Яшчэ адзін недахват. У раён павінны былі прыбыць аўстрыйскія трыеры; зараз высьветлілася, што «калі яны будуць—невядома». У выніку гэтага, трэцяя частка насельніцтва раёну стаіць пад пагрозай застацца к севу з неачышчаным насеньнем. РВК толькі зараз адумаўся, даў дырэктыву «рэкамандаваць сялянству, жадаючаму ачысьціць насеньне, там, дзе няма надзеі на прыбыцьце абозу—ехаць для гэтай мэты ў саўгасы».

А дарога канчаткова сапсавалася, дабрацца да савецкай гаспадаркі ня ўсім лёгка. Чаму раней не прадугледзілі ўсяго гэтага? А на справе гэта прывядзе да таго, што самыя паграпічныя сельсаветы будуць сеяць недабраякасным насеньнем.

Грамадчык.

в. Бабінічы, Ветрынскі р., Полаччына.

ПА АРЦЕЛЯХ І КАМУНАХ.

СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЯ АРЦЕЛЬ „ЧЫРВОНАЯ ВЁСКА“

(Калінкавіцкі р., Мазыршчына).

На прыкладзе гэтай арцелі можна прасачыць, якія цяжкасьці сустракае разьвіцьцё нашых калектыўных гаспадарак.

Арцель «Чырвоная Вёска» арганізавалася ў 1924 годзе на былой абшарніцкай зямлі, па ініцыятыве батракоў, раней працаваўшых у гэтым маёнтку. Да рэвалюцыі гэта былі буйныя маёнткі (2000 дзесяцін зямлі, лес, паравы млын).

— Цяпер нават і ня верыцца, што такім багацьцем уладаў адзін чалавек, —гаворыць сэкратар арцелі,—і куды гэта ўсё ішло? У нас, у арцелі 70 едакоў на 280 гэктараў зямлі і то жывем, грэх жаліцца, ня кепска... А тодзьве тысячы аднэй толькі пахаты...

Пасьля рэвалюцыі тут была арганізавана савецкая гаспадарка, але ў 1922 годзе—ліквідавана.

— Рабочыя савецкай гаспадаркі, былыя батракі гэтага маёнтку,—апавядае сэкратар,—пачалі ў 1924 годзе арганізоўваць камуну. Да іх далучыўся я і яшчэ 11 сямей—часткай бедныя, а часткай серадзякі...

Пачуцьцё прыватнай уласнасьці і індывідуалізму, адвеку выхаванае ў сялян, моцна давала сабе адчуваць спачатку, ды і цяпер яшчэ моцна адчуваецца на разьвіцьці арцелі. Успрыняць адразу ўсебаковае абагуленьне працы і сродкаў вытворчасьці члены калектыву не маглі.

— Спачатку мы прынялі камунальны статут, ну і сарваліся, вядома... дзе-ж можна было жыць камунай, калі і да гэтага часу мы ня можам у поўнай меры абагуліць жывёлу... Ну, і трэба было перайсьці на каапэрацыйны статут...

Ды і каапэрацыйны статут ужываецца ня так проста.

— Яшчэ ў мінулым годзе жывёла ня была абагулена. Кожны лічыў сваёй прыведзеную ім карову. Асабліва цяжка з жанчынамі—яшчэ і цяпер кожная хоча даіць «сваю» карову. Цяжка, ведаеце, але нічога, справа ў нас наладжваецца...

Зараз, як часовая ўступка яшчэ ня зьнішчанаму пачуцьцю ўласнасьці, застаюцца яшчэ не абагуленымі сьвіньні і куры. Уступка гэтая, асабліва ў адносінах да курэй, дорага каштуе ў сэнсе санітарнага стану памяшканьняў, таму што курэй кожная сям'я трымае ў кватэры.

У частцы пэрспэктыў на поўнае абагуленьне, старшыня арцелі настроен аптымістычна.

— Як ні цяжка было, а ўсё-ж «сваіх» кароў перадалі ў камуну, цяпер можна ўзяцца за курэй і сьвіней.

Дарэчы, аб старшыні. Камуніст, селянін-серадняк, ліквідаваўшы сваю гаспадарку, ён уступіў у арцель у мінулым годзе. Арцельлю даражыць, з усіх сіл стараецца наладзіць гаспадарку, мае аўтарытэт, заваёўвае яго асабістым прыкладам.

У сучасны момант у арцелі абагулен увесь жывы і мёртвы інвэнтар, жывёла. У мінулым годзе адлічана ў непадзяльны капітал 500 руб. Арцель пачынае ўкладаць сродкі ў рамонт і пабудову новых памяшканьняў. Пабудавалі новы сьвіран і сушылку. Купілі с.-г. машыны.

Па наліччы гаспадарчых аб'ектаў арцель багатая. Маецца 280 гектараў зямлі: пахаты—125, сенажаці—117, саду—12, гароду—3, выгану—8, лесу—18. Ад савецкай гаспадаркі засталіся ўсе жыльлёвыя і гаспадарчыя будынкі і паравы млын. Жывёлай і сельска-гаспадарчым інвэнтаром арцель забясьпечана ў дастатковай меры. Маюцца ўсе даныя, каб гаспадарка арцелі стала прыкладнай.

Між тым, агрыкультурны ўзровень гаспадаркі нізкі. Палявая гаспадарка вядзецца няправільна. Няма правільнага севазвароту, адсутнічае гатунковае жыта. Засяваецца, галоўным чынам, жыта, бульба. І ўсёткі ўраджай у арцелі значна вышэйшы, чым у сялян.

Жывёлы маецца шмат: 8 рабочых коняй, 11 валоў, 22 дойныя каровы, 13 галоў маладняку, 67 сьвіней. Але ўся жывёла не племянная. Кармленьне жывёлы няправільнае, хлявы ў дрэнным становішчы, на кароўніку амаль зусім няма страхі—уся ў дзюрках.

— Гэта, каб каровы маглі зоркі лічыць. Няхай астраноміяй займаюцца,— жартуе адзін з членаў арцелі.

— Племянную карову ў гэткі хлеў не паставіш... У гэтым годзе хлеў будзе рамантавацца.

Мёртвым інвэнтаром арцель забясьпечана ў дастатковай меры. Сама арцель набыла: 8 плугоў, саху, малатарню, радавую сеялку, увесь дробны інвэнтар.

Жыльлёвых і гаспадарчых будынкаў хапае, але яны знаходзяцца ў дрэнным становішчы таму, што доўга не рамантаваліся. Маецца вялікі абшарніцкі дом, які патрабуе ўнутранага рамонту. Ён амаль што не выкарыстоўваецца для жыльля, а члены арцелі жывуць у халупах, дзе цесна, брудна.

Арцель мела прыбытак у мінулым годзе 6532 руб. На пытаньне, дзе лепшая матар'яльная забясьпечанасьць—у арцелі, ці ў сярэдняй адзінкавай сялянскай гаспадарцы, члены арцелі адказваюць:

— Канешне, у арцелі лепшая. Калі-бы так напружана працавалі як сяляне-адзінкі, то да нас нельга было-б і прыступіцца—былі-б сапраўднымі «кулакамі». Ну, яно, канешне, працуем мы менш, а жывём ня горш, а лепш.

— Возьмем прыклад з мяне,— гаворыць сэкратар арцелі,—да уступленьня ў арцель я меў не слабую серадняцкую гаспадарку, працаваў да сёмага поту, а жыў горш, чымся цяпер.

Нізкі агрыкультурны ўзровень арцелі, апроч таго, што арцель новая, тлумачыцца яшчэ і тым, што няма агранамічнага абслугоўваньня яе.

Пытаньне аб арганізацыі працы і аб формах яе аплаты зьяўляецца самым цяжкім і яшчэ ня вырашаным. Праца разьмяркоўваецца па наліччы працаздольных членаў арцелі. Сыстэма аплаты наступная: дарослыя члены сям'і (муж і жонка) атрымоўваюць 20 руб. у месяц, дзеці школьнага ўзросту—4 руб., недарослыя—2 р. 50 к., адзінокія—15 руб.

— Гэткая сыстэма аплаты не здавальняе членаў арцелі, яна ня спрыяе зацікаўленасьці членаў арцелі ва ўзьняцьці вытворчасьці працы. Мяркуем што небудзь зрабіць, але і не надумаем, як бы гэта лепш зрабіць...

У культурна-бытавых адносінах арцель знаходзіцца на нізкім узроўні. Чырвонага кутка і бібліатэкі ў арцелі няма. Надворна-бытавыя ўмовы мабыць горшыя, чымся ў сялян. У памяшканьнях брудна, цесна, непрытульна.

З прычыны нізкага агрыкультурнага ўзроўню арцелі яе ўплыў на акаляючае сялянства невялікі. А ўсё-ж на прыкладзе арцелі сяляне пераконваюцца ў перавазе вядзеньня калектыўнай гаспадаркі. За апошні год было шмат заяў аб прыёме ў арцель. Вакол арцелі ў раёне Дамановіцкага сельсавету арганізаваны 4 новыя калектывы, адзін—побач з арцельлю на надзельнай зямлі.

Шэраг недахватаў у арцелі—нізкі агрыкультурны ўзровень гаспадаркі, кепска наладжанае жывёлаводзтва, адсутнасьць пляну разьвіцьця гаспадаркі—трэба аднесьці за лік амаль поўнай адсутнасьці арганізацыйнага кіраўніцтва і агранамічнага абслугоўваньня арцелі.

— Год таму назад быў у нас раённы аграном, купіў парасё і ад таго часу мы яго ня бачылі,—так характарызуюць члены арцелі агранамічнае абслугоўваньне.

Арцель маладая, яшчэ не аформілася як належа, але мае ўсе даныя таго, каб разьвівацца і ўзмацняцца.

Трэба толькі значна ўзмацніць арганізацыйнае кіраўніцтва і агранамічнае абслугоўваньне яе.

Я. Дарохаў.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Вялікае разводзьдзе ў Барысаве.

(Ад нашага карэспандэнта).

Не дарэмна кажуць барысаўскія старажылы, што гэткага разводзьдзя, як сёлета і яны ня бачылі ўжо каля 50 гадоў.

Сапраўды, куды ні кінеш вокам, усюды мора вады.

Вось направа відаць на вадзе вузкая стужка,—гэта ўсё, што засталося ад пешаходнай дамбы, яднаючай горад з Новым Барысавам. Дамба амаль што ўся пад вадой, а частка пешаходнага мосту зьнесена.

Будынкі электрастанцыі і фабрыкі камбінату ў вадзе.

Кідаецца ў вочы не адзін дзесятак хат, якія таксама напалову знаходзяцца ў вадзе.

* * *

1-га красавіка гарсавет папярэдзіў усе адпаведныя дарожныя арганізацыі аб падрыхтоўцы ўсіх сродкаў да надыходзячага разводзьдзя. З 5-га красавіка вада ў рацэ пачала прыкметна падымацца. Утварылі зараз-жа спэцыяльную камісію, у якую прыцягнулі ўсе тэхнічныя сілы дарожных атрадаў, пажарныя каманды, міліцыю і гарнізон.

З 7-га-ж красавіка вада пачала прыбываць вельмі шпарка.

Учора знаходзіліся пад вадой: канец Андрэеўскай вуліцы, частка Менскага завулку, уся вуліца 11-га ліпеня, частка Віленскага завулку і Баннай вуліцы, затоплены таксама амаль што ўсе дамы навокал Допру і ўвесь Рачны завулак.

Гэткі-ж малюнак і ў канцы Маскоўскай вуліцы. Усяго знаходзіцца пад вадой у розных мясцох гораду каля 100 дамоў з усімі надворнымі будынкамі.

Як ужо казаў вышэй, затоплены ўвесь пляц камбінату,— лесапільны завод і капыльная фабрыка затоплены і спынілі працу.

У Н.-Барысаве за лініяй чыгункі супроць заводу „Комінтэрн“ знаходзіцца пад вадой рабочы пасёлак—каля 80 дамоў з усімі халоднымі будынкамі.

У горадзе на Чырвонаармейскай слабодцы вялікай крыгай лёду зачапіла і было панясло адну хату, але яе ўдалося выратаваць.

Учора атрымана паведамленьне з Веселова (15-17 в. ад гораду) аб тым, што да 10 гадзіны раніцы вада спала на 7 сантымэтраў, але вечарам у горадзе гэтага яшчэ ня было прыкметна.

Рост калектыўных гаспадарак.

Мазыр, 10-4. *На 7 красавіка па Мазырскай акрузе арганізавана 11 новых калектыўных гаспадарак на надзельнай сялянскай зямлі. За час пасеўнай кампаніі будзе арганізавана яшчэ 21 калект. гаспадарка, а спэцыяльных аб'яднаньняў—60. Інструктар акрсельсаюзу і працаўнікі зямельнага аддзелу выехалі на вёску афармляць калгасы.*

ШЛЯХАВАЕ БУДАЎНІЦТВА.

Магілеў, 11-4. Плян па шляхаваму будаўніцтву на гэты год па акрузе зацьверджан на суму 192.000 руб., з якіх на шляхі акруговага значэньня пойдзе 150.000 р. Акрамя таго дадаткова адпушчана на шляхавае будаўніцтва 64.000 руб. Мяркуецца яшчэ і ад сум па абкладаньню выдаткаваць на шляхавае будаўніцтва 65.000 руб.

ЗА СПЭКУЛЯЦЫЮ—ПАД СУД

Бабруйск, 11-IV. За спэкуляцыю льном-валакном перададзена пракурору справа гандляра г. Бабруйску Мінкіна. Мінкін плаціў за лён-валакно ў два разы даражэй ад існуючых цэн і прадаваў яго з прыбыткам на 250 проц.

Пытаньні дыскусіі ў КПЗУ*).

У гэты-ж час на Савецкай Украіне адбываецца перагрупоўка сіл украінскага і вялікарасейскага нацыяналізму проці СССР.

Асновы вялікарасейскага шавінізму глыбока заселі ў гушчы расейскага ці русіфікаванага гарадзкога мяшчанства, моцна жывуць сярод інтэлігентаў-спэцаў, маюць значную дапамогу ад расейскага мяшчанства на Украіне і асабліва адбіваюцца ў настроях часткі працаўнікоў савецкага апарату. Вялікарасейскі шавінізм імкнецца прыдушыць разьвіцьцё украінскай культуры вялікарасейскаю культураю, зрабіць на Украіне расейскую мову пануючаю. Ён узводзіць паклёпы на украінскую культуру і украінскую мову, распаўсюджвае пра яе весткі і погляды як пра другарадныя недаразьвітыя культурныя каштоўнасьці ў параўнаньні з расейскаю культураю. Ён разьвівае да працэсу культурна-гаспадарчага будаўніцтва Украіны пагардныя, панскія адносіны, вартыя найгоршых узораў старога царскага чыноўніцтва. Вялікарасейскі вялікадзяржаўны шавінізм на Украіне, які паходзіць з дарэвалюцыйнага прыгнечаньня царскай Расеяй украінскіх рабочых і сялян, іх мовы і культуры, сёньня, падрабляючыся пад савецкі склад, праз зьменавехаўства, у форме «узмацненьня» Саюзу Савецкіх Рэспублік, імкнецца зьвесьці будаўніцтва Украінскай Сацыялістычнай Рэспублікі да ролі правінцыі, зьнішчыць яе самастойнае значэньне ў Саюзе Рэспублік і зрабіць у ёй фактычна пануючаю вялікарасейскую культуру.

Гэтыя погляды робяць пэўны нажым на частку рабочых і на асобныя групы сяброў партыі. Вялікарасейскі нацыяналістычны ўхіл у КП(б)У заключаецца ў ігнараваньні ці недаацэнцы нацыянальнага пытаньня на Украіне, у зьмяншэньні значэньня Украінскай рэспублікі ў СССР, у ператлумачэньні стварэньня СССР, як фактычнай ліквідацыі нацыянальных рэспублік, у байках пра нэйтральныя адносіны партыі да разьвіцьця украінскай культуры, у яе трактоўцы, як адсталай сялянскай у процівагу вялікарасейскай «пралетарскай» культуры, у імкненьні абавязкова захаваць перавагу вялікарасейскай мовы ва ўнутраным і дзяржаўным і грамадзкім жыцьці Украіны, у фактычным нежаданьні праводзіць украінізацыю, у распаўсюджаньні шавіністычных вялікадзяржаўных поглядаў аб штучнасьці украінізацыі незразумеласьці «галіцыйскай» мовы, у імкненьні не праводзіць палітыкі украінізацыі ў гарадох і сярод пралетарыяту, абмежаваўшы яе толькі вёскаю, і ў імкненьні паказаць пераблытваньні пры правядзеньні украінізацыі, як сыстэму парушэньня правоў нацыянальных меншасьцяў (расейцаў, яўрэяў). Гэтыя настроі часам у форме абароны нацыянальных меншасьцяў выяўляюцца нават сярод асобных партыйных працаўнікоў. Гэты расейскі нацыяналістычны ўхіл на Украіне зьяўляецца небясьпечнаю пагрозаю зрыву саюзу рабочых і сялян Украіны і ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва на Украіне. КП(б)У з посьпехам перамагала гэты ўхіл і ў далейшым павінна праводзіць проці яго рашучую і няшчадную барацьбу.

* * *

Аднак, супярэчнасьці пераходнага пэрыяду, рост кулацкіх элемэнтаў на вёсцы, падрастаньне украінскай гарадзкой нэпаўскай буржуазеі—даюць падставу для ідэалёгічнага афармленьня і украінскага нацыяналізму на Савецкай Украіне.

За апошні час украінскі нацыяналізм выявіўся ў форме арыэнтацыі ўсяго гаспадарчага і культурнага працэсу Украіны на буржуазны Захад, у процістаўленьні Украінскай рэспублікі іншым рэспублікам Савецкага Саюзу.

Гэты нацыяналізм перакідвае мост польскаму фашызму, кансалідуе свае сілы і імкнецца накіроўваць разьвіцьцё Савецкай Украіны па буржуазным шляху.

Варожыя пралетарыяту погляды на вырашэньне нацыянальнага пытаньня адбіліся сярод некаторых сяброў КП(б)У (Шумскі, Хвілёвы), а ў далейшым аформіліся ў КП(б)У ў выглядзе нацыяналістычнага ўхілу.

Нацыяналістычны ўхіл у КП(б)У недаацэньвае ролі украінскага пралетарыяту ў партыі ў вырашэньні нацыянальнага пытаньня на Украіне. Ён уяўляе сабе партыю, як прадстаўніцу расейскага шавінізму, займаецца нацкоўваньнем украінскіх працаўнікоў, якія стаяць на правільнай партыйнай пазіцыі ў нацыянальным пытаньні, узьнімае пытаньне аб зруйнаваньні асноўных кадраў партыі і зьяўляецца апалёгетам буржуазнай пропаведзі арыэнтацыі на буржуазную Эўропу ў процівагу Маскве, як цэнтру сусьветнага сацыялістычнага руху. «Калі справа ідзе аб пралетарыяце—гэтае процістаўленьне украінскай культуры ў цэлым вялікарускай культуры, таксама ў цэлым, азначае самае бессаромнае здрадніцтва інтарэсаў пралетарыяту на карысьць буржуазнага нацыяналізму» (Ленін. «Национальный жупел ассимиляторства», т. XIX).

Шлях разьвіцьця самастойнай украінскай сацыялістычнай культуры, якая выкарыстоўвае для свайго поўнага росквіту ўсе дасягненьні сусьветнае культуры, — гэта шлях супрацоўніцтва ў культурным будаўніцтве з братэрскімі народамі Саюзу Савецкіх Рэспублік, а не варожага процістаўленьня аднэй культуры другой.

Поруч з гэтым трэба зазначыць на дасягненьні КП(б)У у правядзеньні гаспадарчага і культурна-нацыянальнага будаўніцтва УССР. Ва украінскай школе на украінскай мове навучаецца больш 2 міліёнаў дзяцей украінскіх рабочых і сялян. За апошніх 7 гадоў мірнага будаўніцтва Украінскай Савецкай Рэспублікі на украінскай мове выдана ўдубальт больш кніжак, чымся за папярэдніх 130 гадоў гісторыі украінскага народу. Тыраж украінскіх газэт на украінскай мове ўзрос з 90.000 адбіткаў у 1924 годзе да 500.000 адбіткаў у 1927 годзе. Таксама няўхільна штогоду расьце вылучэньне актыву украінскіх працаўнікоў як у партыі, так і ў камсамоле. Адначасна ў гаспадарчым будаўніцтве Савецкая Украіна ў некаторых галінах, як у сельскай гаспадарцы, так і ў асобных галінах прамысловасьці, перасягнула даваенны ўзровень.

Засеўная плошча ў сельскай гаспадарцы Украіны ўзрасла з 17-ці міліёнаў дзесяцін у 1923-24 годзе да 21-го міліёну дзесяцін у 1926-27 г.

Валавая прадукцыя мэталюргічнае прамысловасьці ў даваенных рублёх узрасла з 172-х міліёнаў у 1924-25 г. да 370-ці міліёнаў рублёў у 1926-27 г.

Прадукцыя цукровае прамысловасьці ўзьнялася з 24-х міліёнаў пудоў у 1924-25 г. да 46-ці міліёнаў рублёў у 1926-27 г.

Бюджэт Украінскай Савецкай Рэспублікі ўзрос з 271 міліёну р. у 1924-25 г. да 524 міліёнаў у 1926-27 г.

Гэта ёсьць вялікі зрух культурна-палітычнай і гаспадарчай працы будаўніцтва сацыялістычнай Украіны, якую пралетарыят Украіны заклікан вырашыць пад кіраўніцтвам кампартыі. Гэты працэс на Украіне павінен ісьці і ў далейшым па пралетарскім шляху і ў выніку прывесьці да украінізацыі пралетарыяту, да сапраўднага пераходу украінскай нацыянальнай культуры ў магутную зброю будаўніцтва сацыялізму. Хто гэтага не разумее, той далёка стаіць ад ленінскага погляду на вырашэньне нацыянальнага пытаньня ў эпоху будаўніцтва сацыялізму і пралетарскіх рэвалюцый.

* * *

Нацыяналістычны ўхіл у КП(б)У на Савецкай Украіне адбыўся ў КПЗУ і быў падтрыманы большасьцю ЦК КПЗУ. На пленуме КП(б)У, дзе КП(б)У падсумоўвала памылкі нацыяналістычнае апазіцыі, прадстаўнік КПЗУ т. Максімовіч выступіў з падтрыманьнем групы Шумскага. На пленуме ЦК КПЗУ ў красавіку большасьць ЦК па пытаньні аб нацыяналістычным ухіле ў КП(б)У выказалася проці пастаноў ЦК КП(б)У і галасавала проці рэзалюцыі прадстаўніка Камінтэрну, які ганьбіў гэты ўхіл.

Падтрымліваючы няправільныя, ненінскія погляды групы Шумскага ў КП(б)У, ЦК КПЗУ гэтым самым паслабіў трываласьць рабоча-сялянскіх мас, якія выступаюць проці фашызму і украінскага нацыяналізму на Заходняй Украіне. Замест таго, каб пабальшавіцку выступіць з непасрэдным і правільным асьвятленьнем падзей на Савецкай Украіне, ЦК КПЗУ непатрэбнымі словамі захоўваў сваю сапраўдную нацыянал - апартуністычную пазіцыю ў нацыянальным пытаньні.

У прэсе зьмяшчаліся артыкулы, якія па сутнасьці франдыравалі проці пастановы ЦК КП(б)У і абаранялі групу Шумскага. Такія паводзіны большасьці ЦК КПЗУ ўносілі блытаніну у рады партыі, пралетарыяту і шырокіх працоўных мас, якія па сваіх настроях блізкія да партыі. Гэта-ж давала ундаўскаму лягеру зброю для павялічэньня паклёпнай кампаніі проці УССР. Адсутнасьць правільнага ленінскага разуменьня нацыянальнага пытаньня, адмова ЦК КПЗУ падтрымліваць у гэтым пытаньні КП(б)У прыводзілі да ўзмацненьня кампаніі украінскага буржуазна-нацыяналістычнага лягеру проці УССР. На ЦК КПЗУ у даным пытаньні ў вялікай меры выявіліся нажым і ўплыў дробна-буржуазных нацыяналістычных элемэнтаў. У міжнародных варунках УССР такі кірунак з боку большасьці ЦК КПЗУ зьяўляўся самаю цяжкаю палітычнаю памылкаю.

* * *

Пераарыэнтыроўка украінскіх буржуазных сіл, апазіцыя ў нацыянальным пытаньні ў КП(б)У адбілася і на такой арганізацыі, як Сельроб. Пытаньне аб тым, хто павядзе за сабою асноўныя кадры бядняцка-малазямельнага і серадняцкага сялянства—нацыянальная украінская буржуазея і украінская дробная буржуазея ці украінскі пралетарыят у саюзе з польскаю рабочаю клясаю,—залежыць ад правільнага палітычнага і тактычнага напрамку КПЗУ. Аднак, кіраўніцтва КПЗУ ва ўмовах дробна-буржуазнага абкружэньня само падпала пад уплыў дробна-буржуазнай стыхіі.

Усё гэта прывяло кіраўніцтва КПЗУ да таго, што ў яго не хапіла ні волі, ні аўтарытэту, каб стварыць такі нажым шырокіх мас, які здолеў-бы прымусіць Сельроб парваць і адмежавацца ад агульна-нацыянальнага украінскага клюбу. Гэтая палітыка нерашучасьці і ваганьняў спрыяла ўзмацненьню ў Сельробе пазіцый, варожых нацыяналістычных элемэнтаў, якія разьвілі цкаваньне проці СССР і УССР.

* * *

Зямельная парцэляцыйная «рэформа» Пілсудзкага дала нікчэмныя вынікі. КПЗУ абавязана была правесьці проці яе рашучую барацьбу і выкрыць яе контр-рэвалюцыйны характар.

Аднак, замест бальшавіцкага лёзунгу «зямля бяз выкупу сялянам», ЦК КПЗУ раіў для абласьцёў, дзе адбывалася парцэляцыя, другі няправільны лёзунг: «зямля сялянам па цэнах назначаных самімі сялянамі».

Такія мерапрыемствы разбройваюць масы сялянства і ў барацьбе з польскім фашызмам у некаторых гушчах могуць даць уяўленьні магчымага супольнага жыцьця украінскага селяніна з польскім памешчыкам. Гэтая памылка КПЗУ разам з памылкаю па нацыянальным пытаньні сьведчыць, што ў партыі ёсьць апартуністычны ўхіл.

* * *

Разам з тым трэба адзначыць дасягненьні ў працы КПЗУ за апошні час.

Не зважаючы на нелегальнае існаваньне, тэрор з боку польскага фашызму, які значна паслабіў рады КПЗУ, партыя наладзіла правільна масавую працу, умацавала свой уплыў у масавых арганізацыях і вядзе іх за сабою. Гэта пацьвярджае праведзеная нядаўна выбарчая кампанія, якая праходзіла ў надзвычайна цяжкіх умовах. КПЗУ ўзмацніла свой уплыў сярод пралетарыяту. Яна правяла ўсеагульную забастоўку рабочых дрэваапрацовачнай прамысловасьці, а таксама забастоўку рабочых нафтавых промыслаў, зьвязаную з растрэламі ў Дзьвінячы і Надвірнай. КПЗУ правяла забастоўку сельска-гаспадарчых рабочых, якая па сваіх разьмерах пасьля забастоўкі 1902 году зьяўляецца самаю вялікаю. Яна замацавала свае пазіцыі ў прафсаюзах, правяла некалькі забастовак выключна палітычнага характару (забастоўка ў Стрыі і Сколе, дэманстрацыя 1 мая 1927 году).

Асобна трэба адзначыць замацаваную сувязь і салідарнасьць працы між КПЗУ і КПП.

* * *

Усе гэтыя памылкі, зразумела, можна выправіць. Аб гэтым і гаворыць пастанова апошняга пленуму Камінтэрну. Каб выправіць іх і ўзмацніць партыю, на наш погляд неабходна:

а) Правесьці шырокую кампанію ў галіне растлумачэньня нацыянальнага пытаньня і дапушчаных памылак КПЗУ з мэтаю ўмацаваць сапраўдныя, ленінскія, бальшавіцкія погляды на нацыянальнае пытаньне і папулярызаваць пастановы КПП, КП(б)У і Выканкому Камінтэрну, а таксама павесьці барацьбу з нацыяналістычным ухілам у партыі, калі такі ў далейшым выявіцца ў арганізацыях КПЗУ.

б) Дапушчаная памылка КПЗУ ў парцэляцыйнай зямельнай рэформе Пілсудзкага вымагае ад партыі выразнасьці палітычных лёзунгаў для арганізацыі барацьбы сялянства проці памешчыцкай дыктатуры польскага фашызму.

в) Асабліва зараз КПЗУ павінна зразумець сваю гістарычную адказнасьць за правільны ленінскі кірунак у нацыянальным пытаньні. Адмова большасьці ЦК КПЗУ ад падтрыманьня нацыянальнай палітыкі, якая праводзіцца КП(б)У на Савецкай Украіне ў сучасных даных і адказных міжнародных варунках СССР, паслабіла барацьбу з нацыяналістычным лягерам у Заходняй Украіне выступленьнем проці УССР.

г) КПЗУ павінна павесьці рашучую барацьбу з усімі ваганьнямі ў нацыянальным пытаньні і, перш-на-перш, з небясьпекаю украінскага нацыяналізму.

д) Фронту згоды між украінскай буржуазеяй і польскім фашызмам, спробам польскага фашызму разваліць нацыянальна-рэвалюцыйны рух украінскіх працоўных мас—партыя павінна процістаўіць рабоча-сялянскі блёк, арганізаваны на плятформе: рабоча-сялянскі ўрад у Польшчы, права на самавызначэньне аж да адлучэньня і аб'яднаньня Заходняй Украіны з УССР.

е) Ухілы ў КПЗУ сьведчаць пра ціск нацыянальна-мяшчанскай стыхіі. Гэта патрабуе павялічэньня прапорцыі сярод пралетарыяту, большага ўцягненьня яго ў партыю, вылучэньня актывістаў з рабочых на кіруючую працу і стварэньня кіруючага кадру з заходня-украінскага пралетарыяту.

Толькі такі напрамак можа выправіць усе дапушчаныя памылкі, узьняць сапраўднае бальшавіцкае кіраўніцтва рэвалюцыйным рухам Заходняй Украіны і павядзе міліённыя масы украінскіх рабочых і сялян разам з польскімі рабочымі і сялянамі да новых перамог над фашызмам.

(*Канец*).

К.

*) Канец. Гл. «Сав. Бел.» № 86.

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
№ 87 (2275) ЧАЦЬВЕР, 12-га КРАСАВІКА 1928 г.

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

БОЛЬШ УВАГІ ГРАМАДЗКАЙ ПРАЦЫ СЯРОД БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ.

Настаўнік—лепшы дапаможца ў працы партыі і камсамолу на вёсцы. Але не заўсёды мы маем у асобе настаўніка дапамогу. Частка (праўда, нязначная) ёсьць і такіх, што рукамі і нагамі адмахваюцца ад якой-бы ні было грамадзкай працы. Гэта, галоўным чынам, тыя, што стаяць далёка ад сялянства па свайму сацыяльнаму паходжаньню. Мы маем факты, што ў момант «крызісу» на вясковых настаўнікаў (у зьвязку з пашырэньнем школьнай сеткі) у настаўніцкую сям'ю папаў чужы элемэнт. Такія асобы, вядома, не дапамога партыі.

Затое той дзень адзначаецца сьвятам, калі прыяжджае ў вёску малады настаўнік, выпушчаны савецкай навучальнай установай. Яго чакае сельсавет, яго чакае камсамольская ячэйка для дапамогі ў працы. Вось чаму ўся грамадзкасьць і асабліва партыя сочыць за тым, каб нашы выпускнікі былі добра знаёмы з грамадзкай працай.

Менскія настаўніцкія ўстановы (пэдтэхнікум, пэд. курсы і вышэйш. курсы грамадазнаўства) зрабілі першы, калі можна так сказаць, экзамен грамадзкай падрыхтаванасьці студэнтаў,—праверана грамадзкая праца на вёсцы ў час адпачынку. Кожным студэнтам была дадзена пісьмовая справаздача.

Заўважана, што той, хто працуе актыўна ў грамадзкіх арганізацыях тэхнікуму, курсаў, той адразу становіцца і ў курсе спраў вёскі, знаходзіць сабе грамадзкую працу. Агульны лік прымаўшых удзел у працы на вёсцы каля 80 проц. Праведзена вялікая праца. Студэнты ўліліся ў правядзеньне кампаніі (распаўсюджаньне аблігацый, хлебазагатоўкі).

Але, як кажуць, у сям'і не бяз вырадка! У той час, калі адны працавалі ў чытальні, наладжвалі спэктакль, бегалі з тэзісамі па сходках,—другія спакойна сабе адпачывалі і ў вус ня дулі. Даволі прывесьці такія характэрныя справаздачы. Адзін піша (з вышэйшых курсаў грамадазнаўства, заначце сабе!):

«Увесь час адпачываў. Прачытаў 12 штук цікавых кніг. Грамадзкай працы, здаецца (?!) ня вёў».

Іначай сказаць: «Лежал и в потолок поплёвывал».

А вось другі яшчэ цікавей піша:

„...Мне грамадзкай працы даручана ня было, дзякуючы чаму я яе і не праводзіў". (Бел. пэд. курсы).

Гэтаму (не ў абіду будзь сказана) яечка абяры і ў раток улажы...

І гэта не адзіны выпадак. Дзесятак такіх справаздач, дзе пішуць накшталт гэтакай: «Грамадзкай працы не вяла з прычыны таго, што даручэньня ў **абавязковым парадку** ня было».

Гэта кажа аб тым, што некаторыя студэнты ня могуць уліцца ў масы, дзе на кожным кроку цябе стрэне праца, а стаяць неяк у баку, пакуль хто не паклапаціцца нагрузіць іх у «абавязковым парадку».

А то яшчэ:

«За час адпачынку ў вёсцы прабаваў удзельнічаць у грамадзкіх арганізацыях. Але расчараваўся,—усюды някультурнасьць, невежаства... Ня мог даждаць канца канікул, каб ізноў у горад махнуць».

Такія настроі адзінічныя. Усё-ж варта на іх зьвярнуць увагу. Новай вёсцы такія настаўнікі не патрэбны.

Задача тэхнікуму і курсаў, каб ня было ні аднаго проценту грамадзка непадрыхтаваных выпускнікоў.

Каб выйшаўшыя з савецкіх пэдагагічных устаноў сапраўды заслугоўвалі назвы новых савецкіх настаўнікаў, і змаглі-б стаць у асяродку ўсяго культурна-грамадзкага жыцьця вёскі.

Я. Пятроўскі.

Настаўнік і статыстыка.

Пры выкананьні комплексных праграм у нашай сучаснай школе, «краякутным» каменем зьяўляецца краязнаўчая праца. Каб не адставаць ад жыцьця, настаўніку трэба дасканала і рупна вывучаць мясцовае жыцьцё—быць краязнаўцай. Таксама патрэбна дзень за днём сачыць за зьменнасьцю жыцьця, мець аб гэтай зьменнасьці поўныя меркаваньні, выяўленыя найчасьцей у ліках. У апошнім выпадку да краязнаўчага матар'ялу далучаецца ўжо і статыстычны матар'ял.

Гэты жыцьцёва праўдзівы матар'ял неабходзен для распрацоўкі ўсіх комплексаў з аб'ектамі блізкімі і далёкімі.

Аднак калі кожны паасобку і будзе вывучаць жыцьцё і зьбіраць статыстычны матар'ял, дык патрэбная поўная сыстэма будзе адсутнічаць і вынікаў з гэтага матэрыялу вялікіх ня зробіш.

Статыстыка-ж, як навука ўсебаковага сыстэматычнага вывучэньня жыцьця, па матар'ялах з месц робіць абгрунтаваныя вынікі і меркаваньні. І чым больш будзе матар'ялу з жыцьця, чым больш гэты матар'ял будзе мець праўдзівасьць, тым больш правільныя меркаваньні будуць дадзены статыстычнымі ўстановамі. Значыць, настаўніку пажадана зьбіраць статыстычны матар'ял у сваёй мясцовасьці па поўнай сыстэме, якую мае статыстыка для дабраахвотных карэспандэнтаў.

Паступова праводзячы гэту працу, настаўнік-дабраахвотны карэспандэнт перш за ўсё будзе мець значную частку каштоўнага матар'ялу для працы ў школе.

Апрача таго, зьяўляючыся дабраахвотным карэспандэнтам, а да слова сказаць, настаўнікаў, занятых гэтай справай пакуль што вельмі мала,—настаўнік будзе мець магчымасьць лёгка набываць самыя апошнія статыстычныя матар'ялы, сабраныя ў даведніках для статкора сваёй газэты і інш.

У праціўным-жа выпадку трэба шмат траціць часу і сродкаў, каб зьбіраць гэты матар'ял з газэт і іншых крыніц.

Прымаючы пад увагу неабходнасьць мець праўдзівы статыстычны матар'ял, бо ў падручніках, друкаваных заўсёды значна раней, чым момант распрацоўкі поўнага комплексу, гэты матар'ял ня жыцьцёвы,—настаўніцтва павінна прыняць удзел у статыстычнай працы ў ролі дабраахвотных карэспандэнтаў. Гэты масавы ўдзел вясковага настаўніцтва ў статыстычнай працы будзе складаць вялікую грамадзкую працу. Настаўніцтва, падаючы матар'ялы з месц будзе дапамагаць вывучаць і адбудоўваць нашу краіну.

Б.

Меншчына.

Аб хворых баках у школьным жыцьці.

Усё часьцей і часьцей старонкі «Чырвонае Зьмены» дапаўняюцца надзвычайна прыкрым, але цікавым матар'ялам, характарызуючым хібы і хворыя бакі жыцьця і працы паасобных школ гораду Менску.

Гэты матар'ял выпячвае тыя недарэчнасьці і чорныя плямы, якія выбухаюць у іншых школах і ганебна зьзяюць на фоне школьнага будаўніцтва, зьяўляючыся, пры параўнаньні з станоўчымі бакамі, адной капляй, але ня чыстае вады, а дзёгцю, які сваім смуродным пахам псуе ўвесь мёд нашага ўпартага будаўніцтва савшколы за часы рэвалюцыі.

Мне, як настаўніку, надзвычайна падабаецца, што справаю будаўніцтва школы пачынаюць цікавіцца тыя, каго гэта непасрэдна тычыцца—наша працоўная моладзь, праз свой авангард—ЛКСМ. Пры гэтым характэрна, што тут ня звычайная зацікаўленасьць моладзі ад «няма чаго рабіць», а выказваецца трывога за будучыню нашае школы, за належнае савецкае выхаваньне школаю працоўнае моладзі, за падрыхтоўку яе да сумленнае разумнае барацьбы за ідэі камунізму і дыктатуру пралетарыяту, да пабудовы сацыялістычнае гаспадаркі і г. д.

Гэта трывога і гвалт выбухлі на строгім аналізе сучаснасьці і зьвязаных з гэтым мажлівасьцях у далейшым. Вось чаму працоўная моладзь, лічучы працу настаўніка ў будаўніцтве школы і гаспадаркі адным з найпачэсных абавязкаў, які толькі можа выпасьці на долю савецкага грамадзяніна, абурваецца і ўступае ў бойку са ўсім тым, што ганьбіць вялікае і пачэснае імя настаўніка, што душыць і затушоўвае яго ролю ў савецкім сацыялістычным будаўніцтве.

Рабочая моладзь таксама не праходзіць міма тэй нязначнай часткі настаўніцтва, якая дагэтуль не пазбавілася ад мяшчанскай ідэалёгіі, абывацельшчыны, падхалімства, нацыянальнай маласьвядомасьці і іншых ганебных зьявішч, дзякуючы якім вядзе працу ў школе не на карысьць дзяржаве і грамадзе, а дапамагае развалу і школы і грамадзкасьці.

Ацэнка і дыягноз таго, што ў некаторай частцы школ ня ўсё яшчэ „благополучно",—рабочай моладзьдзю зроблена правільна і ўзьнят крык па гэтым пытаньні сваячасова, таму, што пажар тушыць больш пэўна, пакуль пачынае толькі тлець.

Хібы, якія заўважаны ў жыцьці нязначнай часткі менскіх школ, бязумоўна, будуць зьнішчаны на месцы і ўплыву на астатнія школы ня зробяць,—наадварот, гэта будзе папярэджаньнем.

Мяне толькі некалькі дзівіць адно, —чаму, апісваючы ганебныя здарэньні ў школах, моўчкі абыходзяць адміністрацыю гэтых устаноў, узваліўшы ўвесь цяжар абвінавачаньня на таго ці іншага стрэлачніка.

Мне думаецца, што адміністрацыя ў установе займае не астатнюю ролю.

Па маёй думцы, школьнаму адміністратару патрэбна дасканала ведаць сучаснасьць, яе запатрабаваньні і мэты, каб сваячасова выявіць хворыя ўхілы ці настроі ва ўстанове, рэагаваць на іх зьнішчэньне пры зараджэньні і даць належны савецкі напрамак жыцьцю ўсяе ўстановы, і тады школа наша будзе выпускаць сапраўды новых людзей, варожых мяшчанскім настроям, людзей сацыялістычнай будучыны.

Настаўнік.

Дайце добрыя жыцьцёвыя задачы.

Маючыяся ў карыстаньні школ 1-ай ст. задачнікі Лойка і Ланкова амаль што зусім пазбаўлены добрых жыцьцёвых задач.

Пры распрацоўцы комплекснага матар'ялу настаўніку кожны дзень трэба траціць шмат часу на складаньне пісьмовых задач па кожнай тэме комплексу і для кожнай групы. Вольнага-ж часу ў настаўніка, асабліва ў вясковага, зімою надта і надта мала. Яго цягне вясковы клюб, розныя грамадзкія культасьветныя гурткі і іншая грамадзкая праца. Да і трэба свой час адпачыць, каб у наступны дзень зноў бадзёрым стаць на працу.

Акрамя гэтага, не заўсёды ёсьць пад рукамі ў кожнага настаўніка лічбавы справачнік аб розных галінах народнай вытворчасьці, каб скласьці задачу на адпаведную тэму. Ад гэтага складзеныя наспех задачы не заўсёды бываюць добра прыстасаваны як з боку свайго зьместу, так і з боку мэтадычнага. У кожнага настаўніка адчуваецца тая ці іншая надта просьценькая аднабаковасьць у складаньні задач. Адгэтуль і вучні маюць надта вузенькі і просьценькі кругазор матэматычных ведаў і часта на выпускных калёквіумах правальваюцца выключна толькі па сваёй мэтаматычнай няпісьменнасьці.

Трэба знайсьці выхад. Я лічу, што тут нам дапаможа наша «Странічка Асьветніка» і вось як:

Трэба знайсьці мэтазгодным і друкаваць у кожным нумары газэты, хоцьбы ўжо і дробненькім шрыфтом, па некалькі вытрыманых з мэтадычнага боку арытмэтычных задачак для кожнай групы і па кожнай тэме.

Гэтыя задачкі ў рэдакцыю будуць з вялікай ахвотай дасылацца настаўнікамі і пэдкалектывамі з розных акруг Беларусі: з вёскі і гораду. Такім чынам, яны (задачы) больш канкрэтна ахопяць усе віды нашай народнай вытворчасьці, як сельскай гаспадаркі, так і прамысловасьці, а таксама сыстэматызуюць свой мэтадычны бок.

Вось будзе тады нам, настаўнікам месц, вялікая дапамога і палёгка ў нашай штодзённай цяжкай працы, і таксама прадукцыя нашае працы яшчэ больш стабілізуецца.

Трэба ў «Старонцы Асьветніка» зьмяшчаць больш такога матар'ялу, які нас цалкам цікавіць у нашай штодзённай практычнай працы.

Хадакоўскі.

АД РЭДАКЦЫІ: Рэдакцыя згодна з тав. Хадакоўскім і прапануе прысылаць задачы, якія будуць пэрыядычна друкавацца ў нашай газэце.

Наша моладзь гатова!

З пачатку навучальнага году ў Амсьціслаўскім Белпэдтэхнікуме пачала праводзіцца ваенізацыя студэнцтва тэхнікуму. Ваенізацыяй ахоплена пагалоўна ўсё студэнцтва: і хлопцы і дзяўчаты, а ўсіх 210 чалавек і 100 курсантаў настаўніцкіх пэдкурсаў пры тэхнікуме. Заняткі ўключаны ў навучальны плян і праводзяцца па праграме вышэйшай дапрызпадрыхтоўкі.

Заснован габінэт вайсковых ведаў, які дае поўныя ўмовы бесперабойнай працы. Габінэт забясьпечан патрэбнай літаратурай і прыладамі. Праводзеньне ваенізацыі таксама забясьпечана патрэбным падрыхтованым кадрам. За 7 месяцаў працы наша моладзь зрабіла многа. Асабліва рабята цікавяцца стралковай справай і тут ёсьць бязумоўна вялікія посьпехі: страляюць метка як хлопцы, так і дзяўчаты. Камсамол у ваенізацыі перадавы. Бязумоўна, ува ўсёй працы адчуваецца поўная вайсковая дысцыпліна яго як у наведваньні заняткаў, так і ў выкананьні распараджэньняў. З наступленьнем вясны заняткі па тактыцы і тапаграфіі будуць праводзіцца на мясцовасьці. Акрамя тэарэтычных заняткаў студэнцтва стала прайшло страявыя заняткі і прадстаўляе з сябе ўпаўне арганізаваную баявую адзінку, якая ў любы час гатова на абарону пралетарскай дзяржавы.

В. С.

ТЭАТР—КІНО.

НОВЫЯ ПАСТАНОЎКІ 2-га БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРУ.

Новы дырэктар БДТ2 т. А. Я. Некрашэвіч аб чарговых пастаноўках і пляне працы тэатру паведаміў нашаму супрацоўніку наступнае:

— Тэатр ладзіць у сёлетнім тэатральным сэзоне дзьве пастаноўкі: «Разлом» Б. Лаўрэнева і «Калі сьпяваюць пеўні" Юр'іна. Першая п'еса пойдзе 22 га красавіка, другая—у канцы сэзону.

П'еса «Калі сьпяваюць пеўні»—адбівае ў сабе нізасьць і ўсю прадажнасьць нямецкай сацыял-дэмакратыі і яе правадыроў. П'еса разварачваецца на фоне барацьбы сацыял-дэмакратычнай бюракратыі з рабочымі дэлегацыямі, якія пабывалі ў СССР і знаходзяцца пад сьвежым уплывам ад усяго бачанага ў Савецкім Саюзе. П'есу ставіць малады рэжысэр з артыстычнага складу БДТ2 т. Міцкевіч, мастацкае афармленьне—Гольца.

Тэма гэтай п'есы на беларускай сцэне зьяўляецца зусім новай. У Маскоўскім Тэатры Рэвалюцыі гэта п'еса прайшла з вялікім посьпехам.

Наступны тэатральны сэзон мы адчынім у Гомелі, дзеля чаго там спэцыяльна будзе перабудавана сцэна. Тэатр мяркуе паставіць п'есу «Рэйкі ідуць» Кіршона. Разам з новымі пастаноўкамі БДТ 2 будзе ставіць і старыя, якія найбольш падыходзяць да сучаснага жыцьця. Апроч гэтага, ёсьць намер паставіць дзьве дзіцячыя п'есы і адну п'есу з сучаснага вясковага жыцьця.

Каб забясьпечыць тэатр сталым мастацкім кіраўніком-рэжысэрам, дырэкцыя запрашае на гэту пасаду выдатнага працаўніка.

„РАЗЛОМ".

(Гутарка з рэжысэрам Сяргеем Разанавым).

Тав. С. Разанаў, які ставіць п'есу «Разлом» у БДТ2, зьўляецца членам асацыяцыі новай рэжысуры (АНР).

* * *

У аснову п'есы Б. Лаўрэнева пакладзен гістарычны эпізод афіцэрскай, контр-рэвалюцыйнай змовы на караблі «Аврора». Аднак аўтар ня прытрымліваецца дакладна гістарычнай праўды і нават самае месца падзеі выведзена ў п'есе не на караблі «Аврора», а на караблі „Заря" і самыя ўдзельнікі змовы не гістарычны. У пастаноўцы п'есы рэжысэр спрабуе ўскрыць ідэі вялікага Кастрычніка і таго разлому, які ўзьнікае ў прадстаўнікоў інтэлігенцыі перад наступіўшым Кастрычнікам.

Наша пастаноўка разьлічана на ўспрыняцьце сучаснага гледача, а ён, як вядома, выхаван на мастацтве кіно. Таму над п'есай прышлося папрацаваць, каб надаць ёй «кінематаграфічны ўхіл».

Па ходу п'есы ёсьць шмат масавых сцэн, матроскія гульні і інш.

Над мастацкім афармленьнем п'есы працаваў мастак Гольц, музыку для п'есы напісаў маскоўскі кампазытар Палавінкін.

„Смеем-ли мы молчать".

(Кіно «Чырвоная Зорка»).

Гэты фільм не прэтэндуе на баявік, баявіком ён і не зьяўляецца. Ён належыць да разраду тых фільмаў, на якія грошы ўсё-ж дарма не патрачаны.

Мы ня бачым тут мастацкіх вобразаў, няма тут нічога новага ў кіно-мастацтве, у кіно-мове і, нават, у кіно-тэхніцы, ня гледзячы натое, што фільм нямецкі. Перад намі разгортваецца звычайная цяжкая драма, праўда, з сюжэтам, які ўжо абрыд.

Рэжысэр Рыхард паставіў перад сабою нятрудную задачу—паказаць увесь трагізм у жыцьці зьбітага з правільнай каляі чалавека, таго чалавека, які ў маладыя гады ведаў толькі п'янкі, куцяжы па цэлых начах, прастытутак і г. д.

Рыхард даволі ўдала паказаў малюнкі з жыцьця маральна падгніўшых нямецкіх буржуа. Дзяўчына з гэтай грамады перад бацькам кідаецца на шыю аднаму, другому, трэцяму каханку; бацька нічога ня кажа, а наадварот, заахвочвае.

У першых трох частках, калі драма пачынае разгортвацца, фільм глядзіцца з цікавасьцю. З таго месца, як пазнаеш ужо зношаны сюжэт (чалавек заражаецца вэнэрычнаю хваробаю,—жэніцца, заражае жонку, родзіцца хворае дзіця і г. д.) фільм робіцца скучным. І вельмі зьбіты сюжэт.

Аднак, артыст Конрад Вэйдт выконвае сваю ролю настолькі добра, што выратоўвае гэтаю ігрою ўсё.

Наогул, фільм ня шкодны. Ён зробіць ня дрэнны ўплыў на нашу моладзь.

С. Аз.

У Дзяржаўным Яўрэйскім Тэатры.

«ПАТОМСТВА».

27-га красавіка Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр ставіць прэм'еру «Патомства». Гэта п'еса малюе сучаснае яўрэйскае мястэчка, дзе зараджаюцца храсткі новага жыцьця.

Дзеля канчатковага афармленьня п'есы з Масквы прыехалі мастакі Фрумкіна і Вішнявецкая.

ЛЕТНЯЕ ТУРНЭ.

5-га мая канчаюцца пастаноўкі ў Менску, і тэатр выяжджае на гастролі на Украіну. У Кіеве тэатр зробіць 18 пастановак, у Харкаве—12, у Адэсе—18.

Па дарозе з Украіны тэатр зробіць некалькі пастановак у Бабруйску.

Становішча масавай палітасьветнай працы па БССР.

Масавая палітасьветная праца грунтуецца на агульна-гаспадарчых і палітычных задачах партыі і савецкай улады. З часоў 14-га партзьезду палітасьветная праца становіцца больш масавай, ахапляе большы, чым раней, лік насельніцтва, увязвае сваю працу з канкрэтнымі і практычнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва.

У бягучым годзе палітычнае выхаваньне сялянскіх мас займае належнае месца ў палітасьветпрацы. Галоўнымі кампаніямі палітасьветных устаноў у бягучым годзе зьўляліся і зараз зьўляюцца — правядзеньне 10-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі, 10-цігодзьдзе Чырвонай арміі, загатоўка хлеба і сыравіны для экспарту, распаўсюджваньне сялянскай пазыкі, самаабкладаньне, пасеўная кампанія, высьвятленьне становішча сялянства Заходняй Беларусі ў зьвязку з працэсам Беларускай Работніцка-Сялянскай Грамады. Па ўсіх гэтых пытаньнях палітасьветнымі ўстановамі праводзілася належная праца.

Агракаапэратыўная прапаганда палітасьветнымі ўстановамі праводзіцца праз сельска-гаспадарчыя і кааперацыйныя гурткі. У 1926-27 годзе сельска-гаспадарчых гурткоў існавала 312, у якіх мелася 6326 членаў. Гэтыя гурткі пры належнай працы прыносяць вялікую карысьць. Так, Смолкаўскі с.-гаспадарчы гурток (Магілеўшчына) арганізаваў машыннае таварыства; удзельнікі с.-гаспадарчага гуртку пас. Расхі, той жа акругі, перайшлі на шматпольле.

Роля некаторай часткі хат-чытальняў у практычным гаспадарчым будаўніцтве вёскі адчуваецца ўжо досыць выразна. Мы маем такія прыклады: па ініцыятыве Навікоўскай хаты-чытальні, Бешанковіцкага раёну, Віцебскай акругі, улетку 1927 году сяляне арганізавалі тарфяное таварыства, па ініцыятыве Стрэлішчанскай хаты-чытальні таго ж раёну, сяляне арганізавалі малочную арцель.

Кіно-перасоўкі зьўляюцца адной з лепшых форм масавай паліт-асьветнай працы. Больш усяго запатрабаваньняў з боку сялян на рэвалюцыйныя кінофільмы, а таксама на такія, якія вучаць гаспадарыць і жыць па новаму.

Усё-ж такі адна недарэчнасьць тут маецца: неакуратна адбываецца перасылка карцін. Гэту недарэчнасьць трэба ў далейшым зьнішчыць, бо ад гэтага адбываюцца перашкоды ў працы.

З мастацкіх форм палітасьветпрацы найбольш распаўсюджаны **драмгурткі**. У 1926-27 годзе існавала 328 драматычных гурткоў з 4473 членамі. Зараз беларускія п'есы ставяцца часьцей, чым у мінулым годзе. Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва выдала некалькі вясковых п'ес, але гэта недастаткова. У далейшым трэба павялічыць выдачу вясковых п'ес.

Што датычыцца справы радыёфікацыі, то тут вялікім недахопам зьўляецца адсутнасьць радыё-тэхнікаў, слабае азнаямленьне з гэтай справай палітасьветных працаўнікоў і адсутнасьць на гэту справу каштарысных асыгнаваньняў.

Вайсковая праца праводзіцца ў большасьці праз вайсковыя гурткі. Гэтыя гурткі досыць добра працуюць там, дзе знаходзяцца вайсковыя часьці. У далейшым палітасьветным установам трэба будзе зьвярнуць больш увагі на вайсковую працу з прыцягненьнем да практычнага ўдзелу дэмабілізаваных чырвонаармейцаў.

Антырэлігійная прапаганда ўвязваецца з працай с.-гаспадарчых і прыродазнаўчых гурткоў. У 1926-27 г. налічвалася 71 антырэлігійных і прыродазнаўчых гурткоў з лікам членаў у іх 1367. Недахопам у гэтай працы зьўляецца: выпадковасьць гэтай працы, адсутнасьць актыву па антырэлігійнай працы, а таксама адсутнасьць кіраўніцтва ячэйкамі «Бязбожнік».

Як-жа абстаіць справа наогул з кіраўніцтвам палітасьветнымі ўстановамі (хаты-чытальні, нардамы і гэтак далей)? Трэба адзначыць, што кіраўніцтва на мясцох з боку палітасьветных працаўнікоў недастатковае. Райінспэктар ня лічыць патрэбным правесьці агляд і інструктаваньне палітасьветных устаноў і калі гэта ім робіцца, то выпадкова і нягрунтоўна. У далейшым перад раённымі інспэктарамі Нарасьветы стаіць задача ўзмацніць кіраўніцтва палітасьветнымі ўстановамі.

Абсталяваньне хат-чытальняў не павялічылася ў параўнаньні з мінулым годам; мэбляй хаты-чытальні забясьпечаны на 60-70 проц. Новых хат-чытальняў за апошнія гады не будавалася. Уласныя будынкі ў большасьці патрабуюць капітальнага рамонту, а па каштарысу на рамонт адпускаецца вельмі мала сродкаў. Увесь час робіцца толькі дробны рамонт. Пры складаньні каштарысу неабходна прадбачыць сродкі на капітальны рамонт, а таксама на пабудову новых памяшканьняў для хат-чытальняў. У далейшым узят напрамак на пашырэньне палітасьветных устаноў за кошт ініцыятывы насельніцтва і грамадзкіх арганізацый.

У заключэньне мы яшчэ адзначым наступнае: з пачатку будучага навучальнага году Магілеўская сав. партшкола рэарганізуецца ў палітасьветны тэхнікум з 4-хгадовым навучаньнем. Тэхнікум будзе рыхтаваць кваліфікаваных палітасьветпрацаўнікоў і дасьць магчымасьць яшчэ лепш паставіць палітасьветную працу.

М. А—скі.

НЕДАХОПЫ Ў ШКОЛЬНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ.

(Па матар'ялах НКРСІ).

Праведзеным нядаўна НКРСІ абсьледаваньнем становішча школьнага будаўніцтва ў БССР высьветлена, што за апошнія гады будаўніцтва школ на тэрыторыі БССР значна разгарнулася. За апошнія 2 гады—1925-1926, 1926-1927 г. г.—выключна на дзяржаўныя сродкі пабудавана 97 двухкамплектных школ. Распачата і няскончана пабудовай 62 школы, што разам складае 65 проц. выконваньня будаўнічага пляну (бяз Гомельшчыны). Па Гомельшчыне за гэты тэрмін пабудавана 23 школы і распачата пабудовай 9 школ. Пазаплянава на сродкі насельніцтва—з дапамогай РВК—пабудавана і прыстасавана з іншых будынкаў да 250 школ, пачынаючы з 1924-1925 г. (у большасьці аднакамплектных). Адначасова з гэтым па справе школьнага будаўніцтва ёсьць шэраг недахопаў. На асноўных з іх трэба застанавіцца.

Адстаём ад будаўнічага пляну.

Здавалася-б, што паколькі ажыцьцяўленьне пляну ўсеагульнага навучаньня, зьвязанае з шырокім разгортваньнем школьнага будаўніцтва, не павінна мець ніякіх адхіленьняў, але на справе робіцца ня так. Наступны матар'ял дае некаторы малюнак, які сьведчыць аб справе школьнага будаўніцтва.

Адставаньне ад пляну тлумачыцца тым, што на пабудову двухкамплектнае школы адпускаецца сродкаў 6000 рублёў, а фактычна будынак абыходзіцца ад 8 да 14 тысяч рублёў. Дзякуючы гэтаму на адпушчаныя сродкі і было пабудована школ значна менш, чым было прадугледжана плянам. Значнай перашкодай у справе школьнага будаўніцтва зьўляецца таксама і несваячасовы водпуск прызначаных па каштарысу сродкаў на пабудову школ. Каштарыс таксама зацьвярджаецца са спазьненьнем—ужо праходзіць сакавік, а на мясцох невядомы былі лічбы сродкаў, адпушчаных на школьнае будаўніцтва.

Грошы скарыстоўваюцца не па прамым прызначэньні.

Клімавіцкі, напрыкл., РВК ня прыступіў да пабудовы школ, а пазычыў сілікатнаму заводу 20.000 рублёў. Праўда, апошні зьверне цэглай, але ад пляну па будаўніцтву справа адстае на 2 гады (на гэту суму).

Магілеўскі Акрана скарыстаў 8.000 рублёў, замест пабудовы школы на вёсцы, на рамонт гарадзкіх школ.

Лупалаўскі РВК страціў 1.341 рубель з сродкаў на новае будаўніцтва школ на рамонт і пабудову іншых будынкаў. Перавёў 5.000 рублёў з будаўнічых сродкаў на рамонт існуючых школ.

Чэрыкаўскі РВК на рамонт 7-мігодкі страціў 1.380 рублёў.

Аршанскай акругай пабудавана 7-мігодка ў Лядах, коштам у 31.000 р.

Быхаўскі РВК ня толькі страціў сродкі на рамонт 7-мігодкі, але атрыманую страхавую прэмію ў суме 3845 руб. (за згарэўшую школу) скарыстаў так: на пабудову электрастанцыі 3362 руб. 43 кап., на пабудову будынку для сельсавету—300 руб. і аплаціў рахунак кааперытыву на 40 руб. і г. д.

Такіх прыкладаў па БССР шмат. Вынік гэтага—адставаньне школьнага будаўніцтва ад пляну.

Пляны школьных будынкаў не рэальны.

Пляны школьных будынкаў, выданыя да гэтага часу НКАсьветы, ня былі складзены па адпаведных мінімальных нормах і ня выходзілі з эканамічных мажлівасьцяў для ажыцьцяўленьня будаўніцтва па гэтых плянах, якія зацьверджаны, да рэчы сказаць, **Дзяржплянам.**

Ініцыятыва Наркамасьветы слабая.

Пляны школьных будынкаў былі складзены толькі на драўлянае будаўніцтва бяз уліку мажлівасьцяў скарыстаньня для гэтага будаўніцтва іншых асноўных будаўнічых матар'ялаў: цэглы, каменьня і г. д. Практыка пабудовы школьных будынкаў у мінулым з цэглы, дрэва і цэглы (драўляны абкладку ў адну цэглу) не адбілася ў будаўнічай школьнай практыцы і ў сучасным будаўніцтве не знайшла сабе месца. Жыцьцё-ж патрабуе больш практычных падыходаў да разьвязаньня справы будаўніцтва школ. Маецца мясцовая ініцыятыва.

Полаччына будуе гліна-хварасныя школьныя будынкі.

Гэты вопыт НКАсьветы ня вывучан з мэтай яго пашырэньня і наогул імкненьня да пабудовы больш практычных і танных школьных будынкаў. Ёсьць раёны, дзе шмат булыжніку, чаму не скарыстаць як вопыт, пабудову каменнага будынку.

Пляны школьных будынкаў не прыстасаваны да кантынгенту вучняў па тэрытарыяльнасьці.

Не прадугледжаны інтэрнаты, пачлежнікі для вучняў у тых мясцовасьцях, дзе насельніцтва рэдкае, напрыклад Мазыршчына. Акрамя таго, пляны ня складзены ў розных варыянтах, дзеля лепшага іх прыстасоўваньня да мясцовых умоў. Няма плянаў 2-хпаверхавых школьных будынкаў, а яны-б каштавалі таньней.

Каштарысы да плянаў школьных будынкаў не ўдасканалены.

Каштарысы былі распрацаваны НКАсьветы, але на практыцы яны мелі шэраг недахопаў, што бязумоўна адбівалася на будаўнічай справе. Кіраўніцтва па справе школьнага будаўніцтва з боку НКАсьветы было недастаткова—адсутнічала фактычная праверка і кантроль над выконваньнем дырэктыў месцамі, якія пасылаліся НКАсьветы ў дастатковай колькасьці.

Пазаплянавае будаўніцтва ідзе стыхійна.

Няма гэтаму будаўніцтву належнага вучоту і сувязі яго з плянавым. Гэтаму будаўніцтву не аказваецца належная тэхнічная дапамога, дзякуючы гэтаму якасьць пазаплянавага будаўніцтва (самім насельніцтвам) зьмяншаецца. Калі-б гэтаму будаўніцтву была належная тэхнічная дапамога, то яго ў далейшым можна было бы ўвесьці ў плянавае кола будаўніцтва.

Няма вучоту кляснае плошчы.

Вучот ня быў пастаўлен як існуючай плошчы, гэтак і патрэбнай, адсутнасьць гэтага вучоту не дае магчымасьці належнага рэгуляваньня справай школьнага будаўніцтва з мэтай ажыцьцяўленьня пляну ўсеагульнага навучаньня. Такі вучот патрэбен і павінен быць дакладна пастаўлен па скончэньні апрацоўкі ЦСК школьнага перапісу, каб была магчымасьць ведаць, якую плошчу мы маем і колькі яе яшчэ не хапае, каб абслужыць школамі дзяцей школьнага ўзросту.

РВК ня маюць цьвёрдых плянаў па будаўніцтву школ. І яны ня ўвязаны з плянамі земляўпарадкаваньня.

Абсьледваньнем высьветлена, што РВК штогодна прызначае месца пабудовы школы. Прадугледжанасьці наперад ніякай няма, гэта вядзе да розных нямэтазгодных выдаткаў. Так, напрыклад, будуюць школу там, дзе насельніцтва ня ідзе насустрач, адмаўляецца дапамагчы па загатоўцы і вывазцы лесу і іншых будаўнічых матар'ялаў. У такіх мясцох, дзе насельніцтва ня ідзе на сустрач і не дапамагае, бязумоўна школы павінны будавацца ў другую чаргу.

У гарадох плянавага школьнага будаўніцтва няма.

Абсьледаваньне паказала, што школьная сетка ня ўвязана з пэрспэктывамі разьвіцьця таго ці іншага гораду. Плянам ня вызначаны месцы пабудовы школьных будынкаў, дзякуючы гэтаму ёсьць выпадкі скучанасьці ў адным раёне гораду і адсутнасьць у другім. Ёсьць па некалькі школ у адным будынку, заняткі вядуцца ў некалькі зьмен. Усё гэта адбіваецца на пэдагагічнай працы; дае ў школе значны лік пераросткаў; школьная мэбля не прыстасавана да ўзросту вучняў, апошняе прыводзіць да паталёгічных зьявішч. Гарадзкія саветы мала зьвяртаюць на гэтае ўвагі. У некаторых гарадох дзеці юцяцца ў непрыстасаваных будынках пад школы, у той час, калі школы заняты іншымі ўстановамі (г. Полацак).

Тэмп будаўніцтва школьных будынкаў марудлівы.

Як агульнае зьвішча, школы будуюцца на працягу некалькіх год. Ёсьць прыклады (Меншчына), што будынкі будаваліся на працягу 3 год, што значна ўздаражала пабудову, а таксама адбівалася на чоткасьці вучоту сродкаў і матар'ялаў. Адсутнасьць сваячасовай загатоўкі, асноўных і дапаможных будаўнічых матар'ялаў прыводзіла да нямэтазгоднага скарыстоўваньня матар'ялаў, што ўздаражала пабудову, а ў некаторых выпадках затрымоўвала тэмп будаўніцтва. Былі выпадкі скарыстаньня сырых матар'ялаў, што памяншала якасьць пабудовы і самога будынку.

Адсутнасьць тэхнічнага нагляду за пабудовай.

Дзякуючы адсутнасьці арганізована пастаўленае гэтае справы маюцца кепскія вынікі ад новай пабудовы школьных будынкаў, патрабуючай новых страт. Шмат школьных будынкаў, у якіх знадворныя сьцены выпучыліся, дзякуючы таму, што сьцены пры пабудове ня браліся ў скрэпы. У некаторых школьных будынках замест прасячной сьцяны, зроблены ўстаўныя аркі. Дахі пабудаваны вельмі крута і ня можа быць натуральнага таяньня сьнегу, фарба будзе зьдзірацца ад падаючых глыб сьнегу.

Падмуркі ў некаторых будынках зроблены з цэглы дрэннай якасьці і няма ўпэўненасьці, што яны ўтрымаюць нагрузку будынку і г. д.

Надворныя будынкі пры пабудаваных школьных будынках амаль што адсутнічаюць. Шмат школ, каля якіх няма нават уборнай. Наогул, аб некаторых момантах школьнае справы прыдзецца пісаць больш падрабязна.

Акрамя вышэйадзначаных момантаў ёсьць шэраг іншых недахопаў, як напрыклад: адсутнасьць вучоту матар'ялаў, якія прывозяцца на мейсца пабудовы школьнага будынку (няма ў некаторых мясцох прыймовых актаў), каштарысаў—папярэдніх і выканаўчых. Шмат выпадкаў прызначэньня настаўнікаў, калі ў вёсцы к гэтаму часу няма ні будынку, ні абсталяваньня, ні падручнікаў, што прыводзіць да лішніх нямэтазгодных выдаткаў. Неадпаведнасьць наёмных будынкаў свайму прызначэньню з боку санітарыі і гігіены, а таксама і кантынгенту вучняў.

У многіх школах зьмяшчаюцца іншыя ўстановы—(сельсавет, суд, хата-чытальня). Ёсьць шэраг наёмных школ, дзе дзеці, каб папасьці ў клясны пакой, праходзяць праз пакой гаспадара; Кватэрнае становішча настаўнікаў дрэннае. Ёсьць выпадкі адгаражваньня маленькіх пакойчыкаў (катушкоў) у клясным пакоі за печкай, альбо наймаецца куток у агульным пакоі з гаспадарам.

Праўда, плянавым школьным будаўніцтвам пабудова кватэр для настаўнікаў прадугледжана, але неабходна дзеля настаўніка стварыць такія кватэрныя ўмовы, каб яму была магчымасьць рыхтавацца да заняткаў.

Ня ўсё добра абстаіць з рамонтам школ. Амаль усюды ня робіцца папярэдні агляд. Прыймовыя акты рамонту складаюцца ў некаторых мясцох без пераліку прац, якія праведзены па рамонту тае ці іншае школы. Кепска пастаўлен вучот па рамоту школ.

Балючае зьявішча з абсталяваньнем школы, у асаблівасьці кляснаю мэбляю, якая загатаўляецца не па стандартных формах, ды і акрамя таго 2-х мясцовыя і 3-х мясцовыя лаўкі для вучняў цяжка прыстасаваць да ўзросту вучняў. Што-ж датычыцца індывідуальнай мэблі—строга стандартнай—то пакуль што пачынаньняў у гэтай галіне няма.

У сувязі з пералічанымі недахопамі калегія РСІ вынесла адпаведную пастанову.

А. НІКАЛАЕЎ.

УСЯ УВАГА ПРАФСАЮЗАЎ—КУЛЬТУРНА-МАСАВАЙ ПРАЦЫ.

(З пленуму ЦСПСБ).

Другім пытаньнем пленум ЦСПСБ заслухаў даклад т. Кулака аб выніках зімовай працы клюбаў і вызначыў далейшыя пэрспэктывы летняй культпрацы прафсаюзаў.

СВАЯЧАСОВА ПАДРЫХТУЕМСЯ ДА ЛЕТНЯЙ ПРАЦЫ.

Пленум адзначыў, што ў мінулым годзе поўнасьцю ня былі скарыстаны грамадзкія работы для абсталяваньня і пашырэньня саюзных садоў і пляцовак, шэраг клюбаў не праводзіў летняй працы. У гэтым годзе трэба сваячасова падрыхтавацца да ўмоў летняй працы, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу летнім экскурсіям па азнаямленьню з гарадамі БССР і іншымі мясцовасьцямі (савхозы, балотныя і агр. станцыі, буйныя прадпрыемствы і інш.).

У адносінах фізвыхаваньня, пленум зьвярнуў увагу на большае ўцягненьне ў яго ўсіх слаёў рабочых, ажывіць працу фізгурткоў, пры пабудове новых заводаў мець на ўвазе пабудову спортзаляў і інш.

БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ КУЛЬТПРАЦЫ.

Беларусізацыя культпрацы павінна быць асноўнай задачай прафсаюзных арганізацый. Адным з важных вучасткаў беларусізацыі павінны зьявіцца клюбы, якія ў сваёй штодзённай працы павінны ўжываць беларускую мову шляхам: пастаноўкі на белмове дакладаў, лекцый, спэктакляў, арганізацыя беларускіх гурткоў (драматычных, літаратурн., краязнаўчых).

Апрача гэтага, пленум зьвярнуў увагу на вывучэньне белмовы ўсім прафактывам.

* *

Учора пленум заслухаў даклад Гомельскага Акрпрафсавету і на гэтым скончыў сваю працу.

Я. З.

БЕЛАРУСКІ СТУДЭНТ.

Рыхтуем чырвоных камандзіраў.

(У Белар. Дзярж. С.-Г. Акадэміі).

Вайсковая падрыхтоўка ў Акадэміі афіцыйна пачала праводзіцца з 1926-27 навучальнага году. Нягледзячы па кароткі час, Акадэмія ў гэтай галіне мае цэлы шэраг значных дасягненьняў. Галоўныя з іх наступныя:

Вучэбны плян і расклад занятаў па ВДВП уключаны ў нармальны плян Акадэміі. Вайсковыя заняткі адбываюцца выключна раніцай. Вызначан пераводны мінімум і максымум. У праграмы агульнаадукацыйных дысцыплін (фізыка, хэмія, матэматыка, геолёгія і інш.) унесен шэраг вайсковых пытаньняў. Заняткі праводзяцца ў аудыторыі ў 800 кв. мэтр., пры якой ёсьць вайсковы габінэт. Пабудован цір на 100 шагоў з цёплым памяшканьнем і байпадамі на 4 стралкоў. З вучэбных дапаможнікаў набыты: матар'яльная частка (зброя), мадэлі, схэмы, табліцы і інш. Колькасьць падручнікаў па вайсковых прадметах набліжаецца да 800 экзэмпляраў.

Ёсьць два вайсковыя выкладчыкі. Мэтад занятку—лекцыі і гутаркі. На II і III курсе тэорыя тактыкі прапрацоўваецца на прыкладах.

Пасьпяховасьць выяўляецца ў 89 проц. (па ліку здавых залікаў).

Наведаньне на розных курсах і факультэтах 65—80 проц. Найлепей наведвае Землабудаўнічы факультэт да (90 проц.).

У галіне ОСО-Авіяхіму катэдра кіруе стралковай сэкцыяй ячэйкі з гурткамі: стралковы—звыш 200 сяброў і інжынэрны—46 сябр.

Інструктар спартыўнага гуртка ўключан у вайсковую прадметную камісію і праводзіць заняткі па ўхваленым прадметнай камісіяй пляне.

Найбольшай пасьпяховасьці ў працы перашкаджаюць няспрыяючыя мясцовыя ўмовы: адсутнасьць у горадзе вайсковых частак, з якіх можна было-б запрашаць кваліфікаваных вайсковых працаўнікоў; недахоп сродкаў і агульныя арганізацыйныя дэфэкты. Мэтадычнай працы па ВДВП вельмі перашкаджае і недастатковая колькасьць выкладчыкаў. Пры катэдры—толькі 2 штатныя выкладчыкі, якія павінны выкладаць па 3—4 прадметы і прымаць да 1500 залікаў у год.

Колькасьць студэнтаў у групе дасягае 60—70 чалавек, што адмоўна адбіваецца на занятках.

Спартыўныя заняткі адбываюцца ў фойэ тэатру ў нязусім гігіенічных умовах. Спартыўных прыладаў мала. Колькасьць гуртка—звыш 200 чалав.—даўно перарасла магчымасьць добра сачыць за фізвыхаваньнем студэнтаў. На ўсю Акадэмію толькі адзін інструктар спорту. Між тым, зацікаўленасьць студэнцтва фізычнай культурай няўхільна расьце. Характар самых занятках у ВНУ—выключна разумовая праца пры вялікай вучэбнай нагрузцы—і даныя мэтагляду гавораць за тое, што фізычнае разьвіцьцё студэнцтва неабходна вывесьці з цёмных завулкаў саматужніцтва на шырокі грамадзкі і вучэбна-выхаваўчы шлях. Без правядзеньня гэтага ў жыцьцё мы будзем рыхтаваць ня практыкаў, а тэарэтыкаў вайсковай справы.

Нагляданьні над студэнтамі, адбываўшымі лягерны збор у 1927 годзе, паказалі, што студэнты хутка стамляюцца і баяцца фізычнай напружанасьці.

На лекцыях і сходах студэнты робяць уражаньне гледачоў у правінцыяльным тэатры: сядзяць у паліто і шапках цэлымі днямі па 8—10 гадз.

Працай у гуртках Осо-Авіяхіму студэнцтва мала зацікаўлена. Большасьць прымае ўдзел у працы гурткоў толькі фармальна.

Дасьледчая праца ў галіне Осо-Авіяхіму знаходзіцца ў стадыі зараджэньня.

Гэта галоўныя недахопы ў нашым быце і вучобе.

У бягучым годзе маецца на ўвазе прыцягнуць студэнтаў I і II курсаў да летніх практычных заняткаў, на якіх студэнцтва павінна набыць уменьне і здольнасьці звычайнага байца, які можа дзейнічаць паасобку і ў складзе вайсковых падразьдзяленьняў.

Грунтуючыся на назіраньнях за лягерным зборам студэнтаў у 1927 годзе, мы ўпэўнены, што на вясеньнія заняткі студэнты вернуцца фізычна больш моцнымі, і тэорыя вайсковай справы будзе замацована практыкай. Гэта дасьць нам сапраўднага камандзіра.

Немчанкаў.

У студэнцкія шэрагі—лепшых

Справа пралетарызацыі вышэйшых навучальных устаноў, хоць у гэтым напрамку зроблена вельмі многа, застаецца актуальнай і зараз, прычым набывае асаблівае значэньне. Вось чаму з наступнага навучальнага году ўводзіцца пэўны процант—асобны для рабочых і асобны для сялян (беднякоў і серадпякоў)—у нормы прыёму ў ВНУ, памяншаць які прыёмовыя камісіі ня маюць права.

Пралетарскае студэнцтва, якое навучаецца ў вышэйшай савецкай школе, вельмі зацікаўлена ў добрым сацыяльным складзе тых, хто ўвальецца ў іх шэрагі і прыдзе сёлета на зьмену канчаючым навучальную ўстанову. Каб даць магчымасьць лепш падрыхтавацца рабочаму маладняку да іспытаў, ячэйка ЛКСМБ Бел. Дзярж. Ун-ту, разам з Выканпрафбюро студэнцтва, арганізавала пры унівэрсытэце курсы падрыхтоўкі ў ВНУ.

Гэтыя курсы адчынены яшчэ ў сакавіку, і адбываюцца тры разы ў тыдзень. Усяго на курсы прынята 427 слухачоў, арганізаваных у 10 груп—усе маладыя рабочыя. Курсы абслугоўваюцца студэнтамі БДУ ў парадку грамадзкай працы.

Праца на курсах працягнецца да 15 чэрвеня. Наркамасьветы неабходна паклапаціцца аб хутчэйшым выданьні праграм і правіл прыёму ў навучальныя ўстановы ў сёлетнім годзе, каб была магчымасьць па іх падрыхтавацца вясковай моладзі.

Разам з гэтым трэба правесьці мэдыцынскі агляд паступаючых. Да гэтага часу ён толькі абвяшчаўся, а ў жыцьці не праводзіўся, у той час, як ён мае надта вялікае значэньне, бо паступаюць часта хворыя, якія ўжо на першым курсе патрабуюць сыстэматычнага лячэньня, а па сканчэньні ВНУ яны зьяўляюцца кандыдатамі для пасылкі на курорты, а не на працу. **Л—ч.**

ХРОНІКА.

Пажар на фабрыцы працкалектыву мэбельшчыкаў.

10-га красавіка ў 8 гадзін вечара, калі на фабрыцы працкалектыву па вырабу мэблі ўжо ня было рабочых, выбухнуў пажар.

Агонь умомант ахапіў аддзяленьне, дзе рэжуцца дошкі. Пасьля таго, як прыбыла гарадзкая пажарная дружына, а яна прыбыла праз 22 хвіліны пасьля паведамленьня аб пажары, доступу да расьпіловачнага аддзяленьня ўжо ня было. Прышлося ратаваць упаковачнае аддзяленьне, дзе стаяла гатовая мэбля ў колькасьці звыш аднаго вагону.

Агонь прапаліў тонкую сьценку, якая разьдзяляла расьпіловачнае аддзяленьне ад паковачнага, і пагражаў зьнішчыць мэблю. Дзякуючы адвазе міліцыянэра і аднаго грамадзяніна, прозьвішча якога невядома, упаковачнае аддзяленьне было адратавана, прычым і міліцыянэр і невядомы грамадзянін атрымалі цяжкія раненьні.

Агнём зьнішчана 2 маторы, цыркулярка (машына), пазовачкая машына, шмат дошчак і інш.

Агонь перакінуўся на суседні дом, але, дзякуючы энэргічнай дзейнасьці ўсіх пажарных каманд, дом быў адратован, і агонь там шкоды амаль ніякай не зрабіў.

Страты ад пажару дасягаюць 2.000 руб.

Плян і каштарыс на пабудову бэконнага заводу зацьверджаны.

Урэшце, пасьля доўгага чаканьня, Управа Белдзяржгандлю пачала складаць канчатковы праэкт пабудоўкі бэконнага заводу ў Воршы.

Тэрмінова даручана прадстаўніцтву Белдзяржгандлю ў Маскве зараз-жа дагаварыцца з вопытнымі інжынэрамі аб складаньні канчатковага праэкту; аднача сова прадстаўніцтву даручана дагаварыцца з «Мясопродуктом» аб тым, каб пабудоўку заводу распачаць зараз-жа.

Вышэйшыя органы СССР зацьвердзілі плян і каштарыс і да пабудоўкі заводу будзе прыступлена ў бліжэйшым часе. Ёсьць надзея, што яшчэ сёлета частка заводу будзе пабудавана. Наркамгандлю БССР прымае ўсе меры да хутчэйшай пабудоўкі заводу. Завод ўнясе шмат ажыўленьня ў нашу прамысловасьць і, галоўнае, значна павялічыць экспортныя рэсурсы Беларусі.

Л.

НК Гандлю зьнізіў цану на цэглу.

НК Гандлю Беларусі праверыў калькуляцыі трэстаў на цэглу, прычым аказалася, што тысяча штук цэглы на менскіх заводах каштуе 29 руб. Гэту цану ВСНГБ таксама лічыць мінімальнай для сваіх заводаў.

На цагельнях Бабруйскага камунальнага трэсту існавала цана ў 30 руб. за тысячу, а НК Гандлю ўстанавіў—29 р. 25 кап.; на Аршанскіх заводах цэгла прадавалася па 37 руб., а цяпер цана ўстаноўлена ў 32 р. 50 к.; на Магілеўскіх была—42 руб., а ўстаноўлена—33 руб.; на Полацкіх прадавалася па 36 руб. тысяча, а НК Гандлю зьнізіў да 31 руб.

10 проц. ад зьменшанага кошту цэглы прыпадае на рахунак спрашчэньня стандарту цэглы, а рэшта—за рахунак розных выдаткаў.

Ачышчана 13.068 тон насеньня.

Водлуг вестак Наркамзему да 1-га красавіка па БССР ачышчана насеньня 13.068 тон, што складае 38,3 проц. плянавага заданьня На першым месцы ідзе Магілеўшчына, якая выканала 82,4 проц. свайго заданьня, а на апошнім—Віцебшчына—22,5 пр. заданьня.

Адчыненьне выстаўкі краязнаўчых зарысовак фатаграфій.

У нядзелю, 15 красавіка, у памяшканьні Беларускага Дзяржаўнага Музэю адчыняецца ўсебеларуская выстаўка краязнаўчых зарысовак і фатаграфій. На выстаўку прыслана каля 3.000 экспанатаў.

Пры адчыненьні выстаўкі выступіць з прамовай загадчык аддзелу друку ЦК КПБ тав. Сянькевіч.

Адчыненьне чарговай сэсіі савету Белкаапсаюзу.

Учора адчынілася чарговая сэсія савету Белкаапсаюзу. На сэсіі будуць заслуханы справаздачы праўленьня Белкаапсаюзу і Белрабсэкцыі, вынікі паявой кампаніі па спажывецкай кааперацыі і вынікі экспортных загатовак за 1-е паўгодзьдзе г. г. У працах сэсіі ўдзельнічае 60 дэлегатаў. На сэсію запрошаны прадстаўнікі дзяржаўных, банкаўскіх і інш. арганізацый.

Як паступаюць пратэрмінаваныя пазыкі.

На 1-га студзеня па сыстэме сельска гаспадарчай крэдытнай кааперацыі налічвалася 1.420.000 руб. пратэрмінаваных пазык, а на 1-га красавіка пратэрмінаваных пазык лічылася толькі 592.000 руб. З гэтай сумы 298.000 руб. прыпадае на запазычанасьць да 1-га студзеня, а рэшта на студзень-сакавік.

Такім чынам, за час кампаніі сыскана 1.122.000 руб. пратэрмінаваных пазык.

Мэталётавары для БССР.

Праўленьне Мэталесындыкату прызначыла завезьці ў БССР у красавіку розных мэталётавараў на 238.000 руб. У гэтым ліку будзе завезена гаспадарчых і саматужных мэталётавараў на 65.000 руб.

Арганізацыя рыбна-гаспадарчага аддзелу.

Пры Наркамземе гэтымі днямі арганізован рыбна-гаспадарчы аддзел, у задачу якога ўваходзіць наладжаньне рацыянальнай эксплёатацыі рыбна-гаспадарчых абшараў, маючых рэспубліканскае значэньне. На аддзел ускладаецца абавязак вызваліць рыбака ад уплыву прыватнага капіталу і прыватнага арандатара, накіраваўшы яго дзейнасьць праз сельска-гаспадарчую кааперацыю. Апроч таго, рыбна-гаспадарчы аддзел мае правесьці значную працу на разьвядзеньні рыбы і экспорту яе.

Наш экспорт і імпорт у сакавіку.

У працягу сакавіка асноўны экспартцёр Беларусі разьвіў значную работу па экспорту і імпорту.

За гэты месяц экспартаваны наступныя тавары: лёну—115.967 кгр., рванкі—26.428 кгр., кудзелі—68.376 кгр., ахлопку—42.590 кгр., пянькі—2.475 кгр., ільнянага пуху—38.471, грыбоў сушаных—23.900 кгр., шпігнару—57.500 кгр., смалы—340.873 кгр., пушніны—на 150.000 руб., конскага воласу—4.771 кгр., шчаціны—5.078 кгр., сьвінога пуху—15.709 кгр., авечай воўны—10.157 кгр., кароўяй воўны—9.600 кгр., яек—110 скрыняў, рыбы сьвежай—8.327 кгр., цыбулі—41.335 кгр., крахмалу—362.459 кгр., воску—3.290 кгр., рызызя—96.787 кгр., рабіны—9.652 кгр., крэйды—16.520 кгр., капыт—1.665 кгр. і лесаматар'ялаў—на 6.000 руб.

Апроч таго, у сакавіку былі разасланы ўзоры новых відаў экспорту, як саломка для вырабу капялюшоў, экстракты з садавіны, патака, яблычнае пюрэ, сушаныя яблыкі ды іншыя віды тавараў, да гэтага часу зусім не экспартаваных.

У зьвязку з пасеўнай кампаніяй імпортны аддзел у сакавіку атрымаў цэлы шэраг каштоўных тавараў, з якіх адзначым: 11 трактараў, на суму звыш 22.000 руб., манільскі шпагат для вязаньня снапоў, калійную соль для ўгнаеньня, цімафейку і, апроч таго, рознае іншае насеньне і ўгнаеньні у колькасьці 460.000 кгр. Усё насеньне ўжо разьмяркована паміж сялянамі праз сельска-гаспадарчую кааперацыю, Наркамзем ды іншыя органы.

Апроч таго, у сакавіку Дзяржгандлем атрыманы ў значнай колькасьці сушыльні—вельмі важнае абсталяваньне для сушкі садавіны.

Рыхтуемся да 1-га Мая.

Падрыхтоўка да сьвята 1-га Мая ў Менску і ў раёнах ужо распачалася. Пры ўсіх прадпрыемствах і ўстановах утвораны камісіі для правядзеньня падрыхтоўчай працы да сьвяткаваньня.

1-га Мая ў Менску.

З 10-га красавіка ў габінэце агітпрапаганды пачаліся кансультацыі да 1-га Мая па пытаньнях сацыялістычнага будаўніцтва, міжнароднага становішча і інш.

З 15-га красавіка ва ўсіх бібліятэках будуць арганізаваны літаратурныя выстаўкі.

З 25 да 30 красавіка ва ўсіх клюбах, гуртках і на прадпрыемствах у часе абедзеных перапынкаў будуць высьветлены пытаньні міжнароднага рэвалюц. руху і сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне. Апрача гэтага, да сьвята 1-га Мая будзе падрыхтован выпуск школ дарослых, лікпунктаў і жаночых гурткоў. Гурткі фізкультуры рыхтуюць цэлы шэраг выступленьняў у садзе «Прафінтэрн» і клюбах. Таксама будуць наладжаны масавыя гульні працоўных.

30-га красавіка а 9 гадзіне ўвечары, камсамольская арганізацыя разам з чырвонаармейскімі часьцямі наладзяць факельнае шэсьцьвіе па гораду.

1-га Мая раніцай на пляцу Парыскай Камуны адбудзецца парад Чырвонай арміі з удзелам прадстаўнікоў ураду, АВК, Гарсавету, рабочых і прафсаюзаў. Пасьля параду будзе праведзена агульна-гарадзкая дэманстрацыя, карнавал і інш.

А 7 гадзіне ўвечары (1-га Мая) адбудзецца адчыненьне саду «Прафінтэрн». У гэты-ж дзень для рабочых і іх сем'яў будуць праведзены бясплатныя сэансы ў кіно.

Сьвяткаваньне ў вёсцы.

У вёсцы сьвята 1-га Мая будзе праведзена пад знакам большай папулярызацыі пастаноў 15 зьезду УсеКП(б), шырокага высьвятленьня міжнароднага становішча, у прыватнасьці працэсу Беларускай Грамады і пытаньняў разброеньня і пагрозы вайны. Апрача гэтага, будзе праверана падрыхтаванасьць да вясеньняй сяўбы.

30-га красавіка адбудуцца ўрачыстыя пасяджэньні ўсіх арганізацый вёскі.

1-га Мая ў раёнах і ў больш буйных вёсках адбудуцца дэманстрацыі, адчыненьне культурных устаноў, закладка паказальных зямельных вучасткаў, закладка хатчытальняў і інш. на сродкі самаабкладаньня. Увечары будуць наладжаны масавыя сялянскія гульні.

Пабудова новых крахмальных заводаў.

Сёлета будзе будавацца новы крахмальны завод у савецкай гаспадарцы «Хорохуць», Гомельскай акругі; таксама будуць закончаны 2 крахмальныя заводы, якія зараз будуюцца ў савецкіх гаспадарках «Весялова», Менскай акругі і «Леніна», Бабруйскай акругі.

Дзяржплян БССР на гэту мэту асыгнаваў 190.000 руб.

Заводы будуць абсталёваны навейшымі замежнымі машынамі. Пабудова гэтых крахмальных заводаў дасьць магчымасьць яшчэ больш павялічыць экспорт крахмалу за межы.

Драматургі, пісьменьнікі, журналісты, карэспандэнты, …тысты і ўсе культурныя работнікі!

У пятніцу, 13-га красавіка, у малой залі клюбу ім. Карла Маркса (ува… …цы Энгельса) адбудзецца нарада па пытаньні—„Якая п'еса патрэбна вёсцы".

На нараду запрашаюцца прадстаўнікі: Наркамасьветы, АПА ЦК і АК …, АПА ЦК і АК ЛКСМБ, Белдзяржвыдавецтва, Галоўпалітасьветы БССР, літаратурныя аб'яднаньні „Полымя", „Маладняк", „Узвышша", „Літаратурная Камуна", Ку… аддзелу ЦСПСБ, Белдзяржтэатру, Дзяржаўнага Вандроўнага Тэатру, драмгурткі рабфаку, Белпэдтэхнікуму, Музтэхнікуму і іншыя зацікаўленыя ўстановы і …нізацыі.

Пэрсанальна запрашаюцца таварышы: Уладыслаў Галубок, Бусел, Сьмелаў, Лякневіч, Ліманоўскі, Міцкевіч (БДТ 2), Сянкевіч, Абрамчук, Даві…, Сташэўскі, М. Грамыка, Цішка Гартны, Якуб Колас, Купала, Зарэцкі, Чарот, Г…, Вольскі, Дыла, Шашалевіч, Кацовіч, Хвасьцюк, Капаевіч, Кузьма Чорны, Л…, Глебка, Ганна Базылёнак.

Пачатак нарады а 7-й гадзіне ўвечары.

ЦК ЛКСМБ і рэдакцыя „Чырвонай Зьмены".

СУД.

Замест выкананьня абавязкаў чытаў эвангельле.

Ня гледзячы на тое, што ў бягучым годзе сельска-гаспадарчы падатак проці мінулага году значна зьменшыўся, сысканьне яго вялося надта марудна і далёка ня ў вызначаны тэрмін.

Нашым друкам, грамадзкімі і партыйнымі арганізацыямі была ўзьнята цэлая кампанія за тое, каб зварухнуць гэтую справу, у большасьці сельсаветаў гэта дало добрыя вынікі, і сялянства ў кароткі тэрмін выканала свой абавязак перад Рабоча-Сялянскай Дзяржавай.

Не абышлося і без нядбайнасьці. Гэтак было з членам Багушэўскага райённага выканаўчага камітэту і намесьнікам старшыні Астапенскага сельсавету Аляксеем Стралковым, які выявіў бязьдзейнасьць у сваёй працы і ня прымаў ніякіх мер да збору сельска-гаспадарчага падатку; а калі ў студзені гэтага году прэзыдыум райвыканкому даў яму дырэктыву ўжыць энэргічныя крокі да спагнаньня падатку і страхоўкі ў трох вёсках, да якіх ён быў прымацован, дык ён, замест таго, каб прыступіць за выкананьня гэтай дырэктывы, накіраваўся на заработкі. Ад якіх ў сельсавет для справаздачы таксама ўхіліўся, і нават, калі супроць яго пачалося сьледзтва, то і ў міліцыю для допыту не зьявіўся, а … шоў лепшым чытаць эвангельле на … ках свайго дзядзькі ў в. Луг. У выні… сеў на лаўку падсудных.

Аршанскі акруговы суд, пры… Стралкова вінаватым у бязьдзейнас…, прыгаварыў яго на паўтары га… воленьня з суровым адмежаваньнем.

5 сакавіка г. г. асуджаны падаў … хоўны Суд касацыйную скаргу.

Вярхоўны Суд у судовым пас… ні 10 гэтага красавіка, разгледзеўшы … сацыйную скаргу і справу Стралкова, … шоў, што прыгавор суду па сутнас… несен правільна ў адпаведнасьці з … насьцямі справы і зацьвердзіў яго, а … справу асуджанага пакінуў бяз выні…

Але пры разглядзе справы ў пара… візійным выявіў, што суд абраў вель… ровую меру сацыяльнай абароны, ўсё… ўзяўшы пад увагу яго сямейнага і ма… нага становішча (пяць душ сям'і, … конь, адна кароза і 4 дзесяціны зям…), выправіўшы гэтае парушэньне ў па… артыкулу 420 КПК, скараціў тэрмін … караньня Стралкову да шасьці месяцаў з… воленьня бяз суровага адмежаваньня.

Шуля…

НАВУКА І ТЭХНІКА.

Вопыт паветранага фатаграфаваньня ўночы.

У другой палове лютага г. г. на аэрадроме Буржэ, каля Парыжу, адбываўся першы вопыт начнога паветранага фатаграфаваньня. Вопыт рабіўся ў прысутнасьці прадстаўнікоў францускага ваенна-паветранага флёту.

Сутнасьць вынаходкі трымаецца ў вялікім сакрэце. Вядома толькі, што мясцовасьць, якую трэба сфатаграфаваць, асьвятляецца ад разрыву бомбы, начыненай кілёграмам магнэзіі. Бомбу трэба скінуць на адлегласьці 100 мэтраў ад тых рэчаў, якія будуць сфатаграфаваны, і яны будуць асьветлены ў працягу ўсяго аднэй пяцідзесятай сэкунды.

Як паведамляюць францускія газэты, вопыт ня даў канкрэтных вынікаў, бо бомба разарвалася занадта далёка. Вопыт рабіў францускі інжэнэр Моро (вынаходца спосабу) і лятун Эргардт.

Падземны канал паміж Марсэлем і ракой Ронай

Марсэль—адзін з самых буйных п… на Сярэдземным моры. Да апошняга … ён ня меў непасрэднага злучэньня з … ранымі воднымі шляхамі Франціі. … хібу ў францускіх водных зносінах … ніла пабудова падземнага каналу «…». Гэты тунэль зьяўляецца самым боль… Эўропе, як па даўжыні, так і па сячэ… Даўжыня канала—звыш 7 кілёмэтраў, … рыня—23 мэтры, вышыня—16 мэтраў.

На пабудову гэтага каналу занадаб… 15 гадоў і каштаваў ён каля 135 міл… франкаў. Выдаткі па праводцы ка… ўзяў на сябе францускі ўрад, Мар… Гандлёвая палата.

Дзякуючы гэтаму каналу, рачныя су…, якія не маглі рабіць марскога перах…, 50 кілёмэтраў ад вусьця ракі Рон…, Марсэля, будуць зараз свабодна прахо… у Марсэль.

Радыё-апарат Томаса Эдыссона.

Вядомы амэрыканскі вынаходца Томас Эдысон зараз заняты канструкцыяй апарату, які аднача сна перадае як сьветавыя, так і гукавыя хвалі.

Нядаўна Эдысон перад невялікай колькасьцю запрошаных спэцыялістых прадэманстраваў свой апарат. У яго лябараторыі перадаваліся з Нью-ёркскай опэры як музыка, так і малюнак таго, што рабілася на сцэне; прычым сцэна была відаць у люстэрку, пастаўленым побач з радыё-апаратам.

Зараз Эдысон працуе над некаторым удасканаленьнем свайго апарату, а галоўнае—каб зрабіць яго больш танным. Мяркуецца, што праз некалькі месяцаў такія апараты будуць выпушчаны ў продаж.

Штучныя выспы на акіяне.

У Нью-Ёрку склалася акцыянэрнае таварыства па пабудоўцы штучных в… на Атлянтычным акіяне. Мэта гэтых … паў—зьяўляцца паветранымі перал… між Амэрыкай і Эўропай.

Таварыства мяркуе паставіць па ро… адлегласьці адну ад аднэй шэсьць высп… авіяцыйных базаў. Яны будуць мець … ля для аэрапланаў і патрэбныя запас… лятуноў. Апрача гэтага, на высьпе … абсталёвана радыёстанцыя і гасьці… Выспы будуць пабудованы так моцна, … змогуць вытрымліваць самыя стра… навальніцы.

Першая такая выспа будзе закончана ў 1930 годзе.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК.

Абл. 1 дзярж. паз.—прад. 4—61,5, куп. 4—59,5; абл. 2-й дзярж. паз.—прад. 4—96,5, куп. 4—94,5; абл. 2-й сял. паз.—куп. 5; абл. 3-й сял. паз.—прад. 5—03, куп. 5—01; абл. 10 проц. паз. 27 г.—прад. 25—17, куп. 25—07; абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 119—50, куп. 117—50; абл. 12 проц. дзярж. паз.—прад. 104—42, куп. 104—37; абл. 5 проц. паз. індустр. прад. 24—34,5, куп. 24—24,5.

У „Маладняку".

У пятніцу, 13 красавіка, а 7 гадз. вечара адбудзецца чарговы сход Менскай філіі ў памяшканьні ЦБ «Маладняка» (клюб К. Маркса).

Павестка дня: 1) Даклад тав. Ба…скага аб творчасьці В. Каваля. 2) Арганізацыйныя справы. 3) Чытка твораў маладнякоўцамі (чытаюць: В. Маракоў, С. …кевіч і інш.).

Прысутнасьць сяброў філіі абавязкова. Уваход вольны.

А 5 гадзіне склікаецца бюро філіі.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛ…А

ТЭАТР-КІНО.

ЯЎРЭЙСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

Чацьвер 12 красавіка „ОВЕЧИЙ ИСТОЧНИК" у 3-х актах.
Білеты ў касе тэатру.

Пятніца 13 і субота 14 красавіка „ГИРШ ЛЕКЕРТ"
Драматычная паэма ў 3-х акт., 10 карц.
Білеты на 13—у саюзе савгандальслуж., на 14 усе білеты прададзены.
Пачатак спэктакляў у 8 з пол. гадз. веч.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".
З аўторка, 9-га красавіка, выдатны нямецкі артыст КОНРАД ВЭЙДТ у новай выключнай нямецкай пастаноўцы
„ЦІ СЬМЕЕМ МЫ МАУЧАЦЬ".
Трагэдыя ў 7-х частках.
Пачатак 1-га сэансу ў 7 гадз. веч. ТОЛЬКІ 3 СЭАНСЫ!

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».
3 карціны за адзін сэанс!
I. Савецкі бытавы фільм „ДОМ В СУГРОБАХ" у 6 частках.
II і III. Дзьве амэрыканскія трукавыя камэдыі: „НАХОДЧИВЫЙ ПОКЛОННИК" у 2 частк.
і „ДЖЕК, СЛОН И К-о".
Пачатак сэансаў у 6 з пал. гадз. веч.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ".
2 фільмы за адзін сэанс. 2
I. „ДОЧЬ ДЖУНГЛЕЙ" драма ў 6 частках.
II. „ПОБЕГ" драма ў 6 частках.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».
Яшчэ 6 дзён грандыёзны гістарычна-рэвалюцыйны баявік
„КАСТРЫЧНІК".

С РАЗРЕШЕНИЯ НАРКОМПРОСА
ПРИ ЦСКБ ОТКРЫВАЮТСЯ
ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ БУХГАЛТЕРИИ,
КАЛЬКУЛЯЦИИ и СТАТИСТИКИ.
Курсы имеют целью как переподг. кооперат. работн., так и подгот. новых работников указан. спец. Продолж. курса 8 мес. На курсы принимаются лица с 16 лет с образов. не ниже 4 гр. семилетки. ПО ОКОНЧАНИИ КУРСА ВЫДАЮТСЯ СВИДЕТЕЛЬСТВА. ОКОНЧ. ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ ПРИ ПОСТУПЛЕНИИ НА СЛУЖБУ ПОЛЬЗУЮТСЯ ПРЕИМУЩЕСТВОМ.
Плата за первый месяц 5 руб., а остальные по 4 рубля в месяц вносится вперед в начале каждого месяца. Рассылка лекций начнется с 15 мая с. г. Подр. свед. высылаются за 2—8-копеечные марки. Денежн. переводы адресовать: Минск, Всекобанк, тек. счет № 682, а остальную корресп.: Минск, Всекобанк, заочным курсам.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 19
Менскага Гарадзкога Савету
ад 10 красавіка 1928 г.
аб ахове садоў, сквэраў, зялёных насаджэньняў у горадзе Менску.

Менскі Гарадзкі Савет пастанаўляе:

1) Забараніць на бульварах, сквэрах і ў садох агульнага карыстаньня:

а) Хадзіць, сядзець і ляжаць на траве;

б) Ламаць дрэвы і кусты, рваць галіны і кветкі, касіць і рваць траву;

в) Насьмечваць і кідаць паперу, акуркі, пачкі з-пад папярос, шалупіньне і інш. сьмецьце;

г) Ламаць садовыя лаўкі, градкі, платы і інш. пабудовы ў садох;

д) Праводзіць гульні і займацца спортам, за выключэньнем месц спэцыяльна адведзеных;

г) Езьдзіць па дарожках на вэлёсыпэдах і конна;

ж) Пасьвіць козы, каровы і інш. хатнюю жывёлу як на бульварах, сквэрах, у садох, так і на вуліцах і прывязваць да дрэў і агароджаў коні.

2) Забараніць прывязваць коні на час стаянкі да дэкаратыўных дрэваў, якія растуць на вуліцах, пляцох і рынках і да іх агароджаў.

3) Нагляд за выкананьнем гэтае пастановы ўскладаецца на вартаўнікоў садоў, сквэраў і рынкаў і на Міліцыю.

4) Вінаватыя ў парушэньні аднаго з пунктаў гэтае пастановы караюцца штрафам у разьмеры да 1-го рубля, які плацяць на месцы ўчынку вартаўніку, альбо Міліцыі, атрымліваючы квіток у выплаце.

5) На асоб, якія адмовяцца ад уплаты штрафу, складаецца пратакол, па якім і накладаецца штраф да 3-х рублёў альбо 3 дні прымусовай работы.

Старшыня Менскага Гарадзкога Савету ЯЦКЕВІЧ.

Сэкратар Менскага Гарадзкога Савету ПАСЫНКОЎСКІ.

БАЛАНС
Гомельского Торгово-Промышленного О-ва Взаимного Кредита
НА 1 ОКТЯБРЯ 1927-28 г.

ОБЩЕСТВО ОТКРЫЛО СВОИ ДЕЙСТВИЯ 29 ИЮЛЯ 1923 Г. ТЕЛЕГРАФНЫЙ АДРЕС: ГОМЕЛЬ, «ВЗАИМНЫ…

АКТИВ			ПАССИВ		
I. Касса и тек. сч.	17698	15	I. Оборот. капит. (668 чл.)	23750	65
II. Ценности	2407	13	II. Проч. капиталы и фонды	3574	01
IV. Учет и спец. тек. сч. п/векс.	98713	59	III. Переучет и перезалог	23016	97
VI. Тов.-ссудн. операц.	685	40	IV. Вклады и текущ. счета	65476	59
VII. Корреспонденты	25605	65	VI. Корреспонденты	22088	30
VIII. Расчетные счета	89	81	VII. Расчетные счета	4441	06
IX. Разные дебиторы	139	50	VIII. Разные кредиторы	3712	84
X. Имущество	2077	13	IX. Доходы будущ. года	1203	37
XII. Расходы будущ. лет	642	30	XI. Счет прибылей и убытков	794	87
БАЛАНС	148058	66	БАЛАНС	148058	66

Счет прибылей и убытков за 1926-27 г.

ДЕБЕТ			КРЕДИТ		
А. Текущие расходы	18399	32	А. Проценты полученные	27374	10
Б. Налоги и сборы	1962	39	Б. Комиссия полученная	7070	15
В. Операцион. расходы	12120	09	В. Разн. поступления	379	—
Г. Амортизация	128	17	Г. Результат	—	—
Е. Убытки	1418	71			
Ж. Результат	794	87			
БАЛАНС	34823	55	БАЛАНС	34823	55

Председатель Правления М. Д. ЭСТРИН. Члены (С. Д. МЕТРИКИН. (И. Ф. ПЕРЦОВСКИЙ.

Бухгалтер М. Е. РАЙСКИЙ.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Асабовая кніжка Рэўка Д. С., выд. Менакрваенкаматам, кв. 426.

— Прамысловы патэнт 1 разр. за № 3286 Шыкера В. М., выд. Менакрфо, кв. 427.

— 1) Асабовая кніжка №953, выд. Клімавіцкім РВК, 2) сяброўская кніж. № 695619, выд. саюзам гарнякоў на імя Казлова І., кв 428.

— Вучотна-конская карт. Лісіцы А., выд. Чэрвенскай вучотнай каміс., кв. 429.

— Паявая кніжка № 1213 Паляковай М., выд. Чэрвенскім спажывецкім таварыствам, кв. 430.

— Вучотна-конская кніжка № 131 Сьцепаненка С., выд. Халопеніцкім РВК, кв. 431.

— Асабовая кніжка № 798 Селявіна С. Ф., выд. быўш. Бобрскім ВВК, кв 432.

— Вучотна-конская карт. № 14 Рабцэва Р. І., выд. Крупскім ВВК, кв. 432.

— Асабовая кніжка № 138-36 Шуцко С. А., выд. быўш. Вяляціцкім ВВК, кв 432.

— Вучотна-конская карт. Прыся Е. Д., выд. Крупскім РВК, кв. 432.

—Асабовае пасьведчаньне Гарбачэвай С. Ф., выд. Троіцкім с.-сав. Томскай губ., кв. 451.

—Капэрац. кніжка 17721 Вершэні І. Ф., выд. МЦРК, кв. 452.

—Асабовая карт. Моніча Л. М., выд. Крупскім Ваенкаматам, кв. 453.

—Пасьведчаньне Валчонак Ф. С. аб сканчэньні мэдфака, выд. БДУ у 1926 г., кв. 454.

—Дзьве вучотна-конск.кніжкі Мургі А. Ф., выд. Каралінскім РВК, кв. 455.

—Вучотно-конская карт. Лыскаўца Е., кв. 456.

—Паявая кніжка Прымакі У., выд. вёнскім спажыв.т-вам за № 469-348, кв. 457.

—Сяброўская кніжка 4316 Баразны М. Ф., выд. саюзам Саўгандальслуж., кв. 458.

—Лекавая кніжка Баразны М. Ф., Аршанскай Страхкасай, кв. 459.

—Вучотна-конская карт. Барысава А., выд. Крупскім РВК, кв. 460.

— Прыёмная кніжка № 208 Рабоя В., выд. Любаньскім РВК у 1926 г., кв. 461.

— Вучотна-конская кніжка № 1493 …левіча П. Я., выд. Грэскім ВВК, кв. 4…

— Вучотна-конская карт. № 792 …шэвіча С. І., выд. Пухаўскім ВВК 7-га …скова-конскага вуч. кв. 440.

— Каапэрац. кніжка № 3318 Рудэр… М., выд. МЦРК, кв. 434.

— Конская карт № 257 Дулуба … гр. в. Аўцэцэвіча, кв. 435.

— Пасьведчаньне за № 24-1662 Ка… Корбута, выд. Край ВМС, кв. 436.